


# КАЛЯНДАР юбілейных дат і падзей

# Асноўныя юбілейныя даты

# горада і раёна

## *Кобрынскі раён у фактах і падзеях*

## 1519 год

**Канец дынастыі князёў Кобрынскіх. Кобрын з прылеглымі землямі становіцца каралеўскім уладаннем – староствам (першы староста - Вацлаў Касцевіч). Гэтую дату можна ўмоўна лічыць пачаткам новага перыяду гісторыі горада.**

**Казлоў, Л. Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай / Л. Р. Казлоў // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 31.

**500 гадоў з часу стварэння КОБРЫНСКАЙ ЭКАНОМІІ, гаспадарчай адзінкі Вялікага Княства Літоўскага**

Кобрынская эканомія – каралеўскае зямельнае ўладанне ў Вялікім княстве Літоўскім XVI-XVIII стст., «сталовы маёнтак» вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх, які існаваў у 1519-1795 гг.

**Казлоў, Л. Р.** Кобрынская эканомія / Л. Р. Казлоў // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1999. - Т. 8. – С. 369.

**Казлоў, Л.** Кобрынская эканомія / Леў Казлоў // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. - Мінск, 2007. - Т. 2. - С. 117.

**Казлоў, Л**. Кобрынская эканомія / Леў Казлоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 219.

**Камінскі, М. І.** Кобрынская эканомія / М. І. Камінскі // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. - Т. 6. - С. 44.

## 1589 год, 5 студзеня

**Кобрын атрымлівае Магдэбургскае права (самакіраванне).**

**Казлоў, Л. Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай / Л. Р. Казлоў // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 34-37.

**Чирун, А.** Вольный город /Александр Чирун // Кобрынскі веснік. - 2009. – 19 жніўня. –
С. 5.

**Мартынаў, А.** Унія на Кобрыншчыне / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. - 6 студзеня.

## 1784 год

**Апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі наведвае Кобрын і Гарадзец пад час адкрыцця Каралеўскага канала. У гісторыі Кобрына гэта быў апошні візіт каранаванай асобы. Падыйшоў да канца і каралеўскі час горада.**

**Казлоў, Л. Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай / Л. Р. Казлоў // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 37.

## 1794 год, верасень

**У час падаўлення расійскімі войскамі паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі 5-тысячны атрад пад камандаваннем А. В. Суворава разграміў 14 верасня часці паўстанцаў пад Дзівінам, захапіў Кобрын, а праз тры дні пад Крупчыцамі нанёс паражэнне корпусу К. Серакоўскага.**

**Казлоў, Л. Р.** Картаграфія Беларусі падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі / Л. Р. Казлоў. – Мінск-Брэст, 2004. - 15 с.

**Пліско, Н. М.** Час Суворава / Н. М. Пліско // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 51-57.

**Тадэвуш Касцюшка** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 51.

**1794 год** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 51.

## 1939 год, 22 верасня

**У Кобрын увайшлі савецкія войскі.**

**Пліско, Н. М.** Да новага жыцця / Н. М. Пліско // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 122-124.

**Той незабыўны верасень…** : З успамінаў А. М. Сушчука, ветэрана вайны і працы // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 124-124.

**Князева, В. М.** Сацыяльна-эканамічнае становішча Кобрыншчыны ў 1939-1940 гг. / В. М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 126-130.

**Мартынов, А.** Судьбоносный 1939 / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 6 января. – С. 6.

## 1944 год, 20 ліпеня

**20 ліпеня стаў памятным днём для жыхароў Кобрыншчыны. У гэты дзень войскамі 1-га Беларускага фронту ў ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі 1944 г. быў вызвалены Кобрын.**

**Пліско, Н. М.** Вызваленне / Н. М. Пліско // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 230-231. – 20 ліпеня 1944 г. стаў памятным для жыхароў Кобрыншчыны.

**Яны** вызвалялі Кобрыншчыну // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 232-239.

## 1944 год, 21 ліпеня

**У ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі часцямі 212-й стралковай дывізіі (палкоўнік У. Г. Кучынёў) быў вызвалены Дзівін, цэнтр аднайменнага раёна, тэрыторыя якога ўваходзіць зараз у склад Кобрынскага раёна.**

## 1959 год, жнівень

**У жніўні да Кобрынскага раёна далучаны Аніскавіцкі, Гарадзецкі і Грушаўскі сельсаветы скасаванага Антопальскага раёна, Верхалескі, Дзівінскі, Навасёлкаўскі, Павіццеўскі і Хабовіцкі сельсаветы скасаванага Дзівінскага раёна.**

# Юбілейныя даты населеных пунктаў Кобрынскага раёна

## Акцябр – 495 гадоў з часу першага ўпамінання *(1524)*

**Акцябр** (да 1940 г. Камень Шляхецкі; мясцовая назва Камэнь Шляхэцькый) - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце.

**Акцябр** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1996. - Т. 1. - С. 223.

**Акцябр** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2.Брэсцкая вобласць. - С. 116-117.

**Акцябр** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 562.

## Басяч – 430 гадоў з часу першага ўпамінання *(1589)*

**Басяч** (мясцовая назва Босяч) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. Упамінаецца ў 1589 г.

**Басяч** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 123.

**Басяч** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. –С 567.

## Брылева – 470 гадоў з часу першага ўпамінання *(1549)*

**Брылёва** - вёска ў Кіселявецкім сельсавеце. Упамінаецца ў 1549 г. у інвентары Кобрынскага Спаскага манастыра.

**Брылёва** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 125.

**Брылёва** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 568.

## Буховічы – 460 гадоў з часу першага ўпамінання *(1559)*

**Буховічы** (мясцовая назва Буховычы) - вёска, цэнтр Буховіцкага сельсавета. Вядома з XVI ст. як вёска і маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак Буховічы знаходзіўся ва ўладанні братоў Галянішчавічаў. З 2007 года – аграгарадок.

**Бухавічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 126-127.

**Бухавічы** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1970 . - Т. 2. – С. 486.

**Бухавічы:** Назва населенага пункта паводле легендаў і паданняў // Брэстчына. – Мінск, 1995. – С. 265-268.

**Буховічы** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С 569.

**Буховичи** // Регионы Беларуси : энциклопедия. – В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1.- С. 220.

## Бяроза – 460 гадоў з часу першага ўпамінання *(1559)*

**Бяроза** (мясцовая назва Выроза) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1559 г. Бяроза (Беразое) - маёнтак і сяло ў Кобрынскім павеце ВКЛ.

**Бяроза** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2.Брэсцкая вобласць. - С. 127-128.

**Бяроза** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. –С 570.

## Грушава – 615 гадоў з часу першага ўпамінання *(1404)*

**Грушава** (мясцовая назва Грушово) - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце. Вядома з XV ст. як сяло Кобрынскага княства ВКЛ. У 1404 г. упамінаецца ў лісце князя Вітаўта сярод іншых населеных пунктаў, якія ён аддаў князю Раману Фёдаравічу (родапачынальнік князёў Кобрынскіх).

**Грушава** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007.- Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 137-138.

**Грушава** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1971. - Т. 4. – С. 47.

**Грушава** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 575-576.

**Федорук, А. Т.** Грушево / А. Т. Федорук // Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук ; ред. Т. Г. Мартыненко. – Минск, 2004. – С. 355-360.

**Пятроўская, М.** У Грушаве адзначылі юбілей / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 25 жніўня. – С. 2. - 600-годдзе з часу першага ўпамінання аб вёсцы.

## Імянін – 500 гадоў з часу першага ўпамінання *(1519)*

**Імянін** (мясцовая назва Мнянын) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1519 г. маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ.

**Імянін** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 150.

**Імянін** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. –С. 583-584.

**Імяніны** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1971. - Т. 5. – С. 77.

**Федорук, А. Т.** Именин / А. Т. Федорук // Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук ; ред. Т. Г. Мартыненко. – Минск, 2004. – С. 502-503.

## Ляскова – 460 гадоў з часу першага ўпамінання *(1559)*

**Ляскова** (мясцовая назва Лыскова) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1559 г. маёнтак і сяло Ляскоўскае, у Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанне Рыгора і Фёдара Аглядовічаў.

**Ляскова** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 163-164.

**Ляскова** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 592.

## Мінянка – 420 гадоў з часу першага ўпамінання *(1599)*

**Мінянка** (мясцовая назва Міненка) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Звязда». Упамінаецца ў 1599 годзе.

**Мінянка** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 168.

**Мінянка** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1973. - Т. 7. – С. 254.

**Мінянка** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскіага раёна. - Мінск, 2002. - С. 595.

## Навасадкі – 230 гадоў з часу першага ўпамінання *(1789)*

**Навасадкі** (мясцовая назва Новосадкы) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1789 г. у Азяцкім ключы Брэсцкай эканоміі ВКЛ, вёска, 4 валокі зямлі, 8 двароў, 44 жыхары, бровар, карчма (на арэндзе з 1709).

**Навасадкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 170.

**Навасадкі** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 596.

## Падалессе – 420 гадоў з часу першага ўпамінання *(1599)*

**Падалессе** (мясцовая назва Подоліссе) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1599 годзе.

**Падалессе** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007.- Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 173-174.

**Падалессе** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 598-599.

## Паляцічы – 460 гадоў з часу першага ўпамінання *(1559)*

**Паляцічы** (мясцовая назва Полятычы) - вёска ў Батчынскім сельсавеце. Вядомы з XVI ст. як сяло і маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак, ва ўладанні В. Ц. Варашылы.

**Паляцічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 175-176.

**Паляцічы** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 599.

**Федорук, А. Т.** Полятичи / А. Т. Федорук // Старинные усадьбы Берестейщины. – Минск, 2004. – С. 500-501.

## Патрыкі – 460 гадоў з часу першага ўпамінання *(1559)*

**Патрыкі** - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1559 г. сяло і маёнтак Патрыкавічы ў Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанні Я. С. Мрочкавіча са стрыечнымі братамі.

**Патрыкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 176.

**Патрыкі** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 600.

## Прылукі Вялікія - 460 гадоў з часу першага ўпамінання *(1559)*

**Прылукі Вялікія** (мясцовая назва Прылукы Вылыкы) - вёска ў Астроміцкім сельсавеце. У XVI ст. маёнтак і сяло ў Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак знаходзіўся ва ўладанні М. Лазаровіча з братамі.

**Прылукі** Вялікія // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя . - Мінск, 2007. -Т. 4 кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 180-181.

**Прылукі** Вялікія // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 603.

## Ягалкі – 460 гадоў з часу першага ўпамінання *(1559)*

**Ягалкі** (мясцовая назва Яголкы) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1559 г. маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанне С. Слібоўскага.

**Ягалкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 197.

**Ягалкі** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 615.

## Яромічы – 420 гадоў з часу першага ўпамінання *(1599)*

**Яромічы** (мясцовая назва Еромычы) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце, за 12 км ПнУ ад горада і чыгуначнай станцыі Кобрын., 58 км ад Брэста. Транспартныя сувязі па аўтадарозе Кобрын – Івацэвічы. Упамінаюцца ў 1599 г.

**Яромічы** // Гарады і вёскі Беларусі. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 197-198.

**Яромічы** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 615.

# Памятныя даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем

## 115 гадоў з дня нараджэння І. У. Анціпаровіча *(1904)*

**Анціпаровіч Іван Усцінавіч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. ***Мельнікі*** ў сялянскай сям’і. З прыходам Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 г. Іван Усцінавіч удзельнічаў у наладжванні работы органаў кіравання, арганізацыі народнай міліцыі ў Кобрыне. У чэрвені 1941 г. Анціпаровіч быў эвакуіраваны ў савецкі тыл, дзе служыў у органах унутраных спраў спачатку ў Яльцы, а з 1943 г. - у Бранску. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вярнуўся ў Кобрын. Да 1953 г. працаваў у Кобрынскім РАУС, а калі выйшаў на пенсію - на ткацкай фабрыцы. Памёр у 1993 годзе.

**Анціпаровіч** Іван Усцінавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 113-114. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне (1921-1939).

## 80 гадоў з дня нараджэння Н. В. Амельянюк *(1939)*

**Амельянюк Ніна Васільеўна** нарадзілася ў 1939 г. у в. Лешня Капыльскага раёна. Закончыла гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працавала настаўніцай у в. Азяты, у вячэрняй школе і СШ № 1 Кобрына. У 1979 -1982 гг. - завуч, у 1982 -1996 гг. - дырэктар СШ № 1 Кобрына. Выбіралася дэпутатам гарадскога Савета. Званне «Заслужаная настаўніца БССР» прысвоена ў 1978 г.

**Амельянюк** Ніна Васільеўна // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 429.

## 100 гадоў з дня нараджэння І .І. Арлова *(1919)*

**Арлоў Іван Іванавіч** нарадзіўся ў 1919 г. у в. Бабакава Іванаўскай вобласці, Расія. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў Чырвоную армію, у першыя дні вайны апынуўся ў акружэнні і застаўся на тэрыторыі Кобрынскага раёна. Вясной 1942 г. была арганізавана група, якая называла сябе чапаеўцамі, узначаліў яе І. І. Арлоў, пазней яна стала першым на Кобрыншчыне партызанскім атрадам імя Чапаева. 27 красавіка 1943 г. у час правядзення аперацыі І. І. Арлоў быў цяжка паранены, схоплены і дастаўлены акупантамі ў Кобрын, дзе і памёр. У студзені 1944 г. на базе атрада імя Чапаева была створана партызанская брыгада імя Чапаева, а аднаму з атрадаў прысвоена імя Арлова.

**Арлоў** Іван Іванавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскіага раёна. – Мінск, 2002. - С. 213-214 – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 100 гадоў з дня нараджэння М. А. Астравуха *(1919)*

**Астравух Мікалай Антонавіч** нарадзіўся ў 1919 г. у Мінскай вобласці. У 1940 г. прыехаў у Дзівінскі раён, працаваў старшынёй Павіццеўскага сельсавета, пазней - старшынёй Павіццеўскага сельскага спажывецкага таварыства. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у арганізацыі партызанскіх атрадаў, быў сувязным. У 1943 г. стаў партызанам-разведчыкам. Восенню 1943 г. загінуў пры выкананні задання.

**Астравух** Мікалай Антонавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 219. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 65 гадоў з дня нараджэння С. Д. Ашмянцава *(1954)*

**Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч** нарадзіўся ў 1954 г. у в. Рай Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. У 1979-1990 гг. - намеснік старшыні па аўтатранспарце Кобрынскай райсельгастэхнікі, інструктар, загадчык сельскагаспадарчага аддзела Кобрынскага гаркама КПБ. У 1990-1995 гг. - старшыня калгаса імя Суворава Кобрынскага раёна. У 1995-2002 гг. працаваў старшынёй Кобрынскага райвыканкама, з 2002 г. - намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама, з лютага 2007 г. – старшыня Брэсцкай абласнога Савета дэпутатаў. Узнагароджаны медалем «За працоўныя заслугі», прысвоена званне «Заслужаны працаўнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».

**Ашмянцаў** Сяргей Дзмітрыевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 449. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

## 105 гадоў з дня нараджэння Ф. М. Баранава *(1914)*

**Баранаў Фёдар Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1914 г. Кадравы афіцэр Чырвонай арміі, служыў у Брэсцкай вобласці. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіў у акружэнне пад Баранавічамі. Не маючы магчымасці выйсці з варожага тылу, разам з іншымі ваеннаслужачымі арганізаваў партызанскую групу, якая пазней была ўключана ў асобны атрад імя Шчорса, а потым пераўтворана ў самастойны атрад імя Суворава. Ф. М. Баранаў быў начальнікам штаба гэтага атрада, начальнікам штаба брыгады імя Дзяржынскага. У маі - ліпені 1944 г. Баранаў - камандзір партызанскай брыгады імя Чапаева, якая дзейнічала ў Кобрынскім і часткова Антопальскім раёнах. Брыгада прымала ўдзел у вызваленні Кобрынскага раёна. Узнагароджаны 3 ордэнамі. Пасля вайны жыў і працаваў у Маскве.

**Баранаў** Фёдар Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 214-215. - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 40 гадоў з дня нараджэння І. Г. Бародзіч *(1979)*

**Бародзіч Інга Генадзеўна** - спартсменка. Нарадзілася ў 1979 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па плаванні. Удзельніца Алімпійскіх гульняў у Атланце, неаднаразовая чэмпіёнка Рэспублікі Беларусь па плаванні.

**Бародзіч** Інга Генадзеўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

## 120 гадоў з дня нараджэння Д. С. Барысюка *(1899)*

**Барысюк Дзмітрый Сцяпанавіч** нарадзіўся ў 1899 г. у в. ***Турная***. У час Першай сусветнай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі. З 1917 г. па 1922 г. у

Чырвонай арміі. У 1923 г. вярнуўся ў в. Турная. Член КПЗБ з 1925 г. У Вялікую Айчынную вайну пры актыўным удзеле Д. С. Барысюка ў ліпені 1941 г. створаны Турнянскі антыфашысцкі камітэт, які падтрымліваў сувязь з усімі партызанскімі атрадамі, што дзейнічалі на тэрыторыі Кобрынскага раёна, а таксама з атрадам імя Суворава Пінскага партызанскага злучэння. Д. С. Барысюк загінуў у сакавіку 1943 года. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

**Барысюк** Дзмітрый Сцяпанавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 86, 219. – (Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, Змагаліся ў тыле ворага).

## 525 гадоў з дня нараджэння Боны Сфорца (1494-1557)

Каралева польская і вялікая княгіня літоўская Бона Сфорца д'Арагона нарадзілася 2 лютага 1494 г. ў Віджэвана (Італія) у сям'і міланскага герцага. Яна была другой жонкай караля Польшчы і вялікага князя ВКЛ Жыгімонта I Старога. Бона Сфорца значна пашырыла зямельную ўласнасць дынастыі Ягелонаў, абараняла дзяржаўныя землі ад незаконнага прысваення іх феадаламі, асабліва магнатамі. У 1532 г Кобрынскае староства стала поўнай уласнасцю караля (дакладней, самой Боны) і ў якасці павета ўвайшло спачатку ў склад Падляшскага, а потым у 1566 г. Берасцейскага ваяводстваў. Каралева некалькі разоў прыязджала ў Кобрын. Тут актывізаваліся горадабудаўнічыя работы, была прыведзена ў парадак замкавая служба. Клапоцячыся аб павелічэнні даходаў, Бона заахвочвала развіццё земляробства, гандлю, рамёстваў. Верагодна, тады ж пачаліся і першыя меліярацыйныя работы паблізу Кобрына. Да нашага часу канал, які цячэ праз паўднёва-заходнюю ўскраіну горада, называецца Бона (у мінулым канал каралевы Боны). І яшчэ адно каштоўнае пачынанне звязана з імем гэтай энергічнай каралевы. Пры ёй у практыку ўвайшло правядзенне дзяржаўных інвентарных (статыстычных) абследаванняў - так званых рэвізій. У Кобрыне і старостве першая рэвізія была праведзена ў 1549 г., наступныя - у 1563 і 1597 гг. Дакументы гэтых абследаванняў малююць даволі дэталёвую карціну сацыяльна-эканамічнага жыцця горада ў 2-й палове XVI ст.

У 1556 г. каралева выехала на радзіму ў Італію, вывезла з сабой шмат каштоўнасцей. Яе маёнткі перайшлі да Жыгімонта II Аўгуста. Памерла Бона Сфорца ў 1557 г.

**Казлоў, Л. Р.** Бона Сфорца / Л. Р. Казлоў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 46-47. – (Ад часоў першабытных – 1917).

## 105 гадоў з дня нараджэння А. К. Букрабы *(1914)*

**Букраба Аляксандр Кірылавіч** нарадзіўся ў 1914 г. у в. ***Навасёлкі*** ў сялянскай сям'і. Удзельнік Кобрынскага (Навасёлкаўскага) узброенага

выступлення сялян 1933 г. У 1940-1941 гг. сакратар Навасёлкаўскага валаснога выканкама, дырэктар школы. У Вялікую Айчынную вайну партызан атрада імя Суворава, камісар атрада імя Арджанікідзе брыгады імя Молатава. Пасля вайны працаваў намеснікам старшыні Дзівінскага, старшынёй Дзівінскага, Пружанскага і Антопальскага райвыканкамаў, 1-м сакратаром Шарашоўскага і Пружанскага райкамаў КП(б)Б. Са студзеня 1963 года старшыня Брэсцкага аблсаўпрофа. З верасня 1965 г. і да выхаду на пенсію (1975) - старшыня парткамісіі пры Брэсцкім абласным камітэце КПБ. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам ПНР «Віртуці Мілітары» (залаты крыж) і інш. Памёр у 1977 годзе.

**Букраба** Аляксандр Кірылавіч // Памяць:гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 214-215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 90 гадоў з дня нараджэння А. М. Булавіцкага *(1929)*

**Булавіцкі Аляксандр Мікалаевіч** нарадзіўся 28 кастрычніка 1929 г. у в. Чахец Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1954-1966 гг.- інструктар Пружанскага райкама, Брэсцкага абкама, 1-ы сакратар Шарашоўскага, Кобрынскага райкамаў ЛКСМБ, старшыня калгаса «Запаветы Ільіча» Кобрынскага раёна. У 1966-1968 гг. старшыня Кобрынскага райвыканкама. З 1968 г. старшыня калгаса «Сцяг Перамогі» Кобрынскага раёна, з 1981 г. старшыня Гарадзецкага міжгаспадарчага аб’яднання, з 1982 г. старшыня калгаса-камбіната імя Ф. Э.Дзяржынскага. Першы старшыня Савета калгасаў Брэсцкай вобласці. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, іншымі ўзнагародамі.

**Булавіцкі** Аляксандр Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 450. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

## 65 гадоў з дня нараджэння В. А. Бялінскага *(1954)*

**Бялінскі Віталь Андрэевіч** нарадзіўся 5 жніўня 1954 г. у в. Даўганосы Ковельскага раёна Валынскай вобл., Украіна. Закончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут (1976). Працаваў майстрам ПМК-80 трэста «Слуцксельбуд», майстрам, прарабам, старшым прарабам будупраўлення № 31 у Пінску. З 1984 г. начальнік лабараторыі будтрэста № 2 Пінска, з 1986 г. інструктар Пінскага гаркама КПБ. Потым кіраваў жыллёва-камунальнай гаспадаркай (ЖКГ) Пінска, з 1997 г. першы намеснік начальніка вытворчага ўпраўлення ЖКГ Брэсцкага аблвыканкама. З 17.04.2001 г. да лютага 2002 г. - старшыня Кобрынскага гарвыканкама.

**Бялінскі** Віталь Андрэевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 450. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

## **120 гадоў** з дня нараджэння В. І. Вайткоўскай ***(1899)***

**Вайткоўская Варвара Ігнацьеўна** нарадзілася 4.12.1899 г. Закончыла Екацярынаслаўскую жаночую гімназію (1918). У чэрвені 1940 г. - чэрвені 1941 г. супрацоўнік рэдакцыі чырвона-армейскай газеты «Час Родины» ў Кобрыне, у ліпені 1941 г. - сакавіку 1944 г. - газеты «В бой за Родину» на Карэльскім фронце. Пасля вайны жыла і працавала ў Кобрыне. Узнагароджана медалямі. Памерла ў 1981 годзе.

**Вайткоўская** Варвара Ігнацьеўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 240. – (Крутымі дарогамі вайны).

## **120 гадоў** з дня нараджэння Л. Т. Валасюка ***(1899)***

**Валасюк Лука Трафімавіч** нарадзіўся ў 1899 г. у ***Батчы***. Закончыў настаўніцкія курсы ў г. Роўна (1940). У 1921-1923 гг. служыў у Польскай арміі. З канца 1923 г. сакратар Кобрынскага падпольнага райкама КПЗБ. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны дапамагаў палонным байцам Чырвонай арміі, сем’ям савецкіх ваеннаслужачых. Пазней сувязны партызанскага атрада імя Чапаева. Удзельнік вызвалення Кобрына. Пасля вайны працаваў старшынёй калгаса.

**Валасюк** Лука Трафімавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 234. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## **90 гадоў** з дня нараджэння В. А. Вараб′ёва ***(1929)***

**Вараб’ёў Вадзім Андрэевіч** нарадзіўся 06.05.1929 г. у Брэсце. Закончыў Вольскае авіяцыйнае тэхнічнае вучылішча ВПС (1954), Ленінградскую вышэйшую школу міліцыі (1966). У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік Брэсцкага падполля, сувязны Старасельскага партызанскага атрада (пазней імя Чарнака), з верасня 1943 г. - разведчык атрада імя Шчорса. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына. У 1949-1961 гг. служыў у Савецкай арміі. З 1961 г. у запасе, капітан. Працаваў у органах унутраных спраў у Пскоўскай вобласці, Расія. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Вараб’ёў** Вадзім Андрэевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка.Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 234. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## **80 гадоў** з дня нараджэння І. Б. Венцэля ***(1939)***

**Венцэль Іван Баляслававіч** нарадзіўся 2 студзеня 1939 г. у г. Ляхавічы Брэсцкай воб-ласці. Закончыў Брэсцкі тэхнікум чыгуначнага

транспарту (1958), Беларускі інстытут чыгу-начнага транспарту (1970), Мінскую ВПШ. З 1965 г. - другі сакратар Лунінецкага райкама ЛКСМБ, першы сакратар Драгічынскага райкама ЛКСМБ, намеснік загадчыка аддзела Брэсцкага абкама ЛКСМБ. У 1975-1982 гг. сакратар, другі сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. У 1982-1988 гг. - старшыня Кобрынскага райвыканкама. У 1988-1995 гг. - старшыня Брэсцкага гарвыканкама.

**Венцэль** Іван Баляслававіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 450-451 – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

## 90 гадоў з дня нараджэння Я. А. Воўка *(1929)*

**Воўк Яўген Арсенцьевіч** - палкоўнік медыцынскай службы, кандыдат медыцынскіх навук. Нарадзіўся ў 1929 годзе ў в. ***Мярніца*** Кобрынскага павета (цяпер в. Мярніца Кобрынскага раёна). Яўген Арсенцьевіч - заслужаны ўрач Узбекістана. Памёр у 1986 годзе.

**Воўк** Яўген Арсенцьевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Воўк** Яўген Арсенцьевіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 21.

## 95 гадоў з дня нараджэння М. Ф. Галаднюка *(1924)*

**Галаднюк Мікалай Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. ***Кустовічы***. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскіх груп, партызан атрада імя Кірава. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына, Чэхаславакіі. Дзень Перамогі сустрэў у Германіі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Галаднюк** Мікалай Фёдаравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 234. - (Яны вызваляли Кобрыншчыну).

## 100 гадоў з дня нараджэння М. З. Глёка *(1919)*

**Глёк Міхаіл Зоцікавіч** нарадзіўся 15.10.1919 г. у в. ***Паляцічы***. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1944 г. служыў у 1340-м стралковым палку 234-й стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту, аўтаматчык. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі Германіі, Польшчы, у штурме Берліна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр 30.03.1997 г.

**Глёк** Міхаіл Зоцікавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 241. – (Крутымі дарогамі вайны).

## 60 гадоў з дня нараджэння С. А. Гардуна *(1959)*

**Гардун Сяргей Аляксеевіч (Сергій Гардун) -** святар і вучоны, прафесар, мітрафорны протаіерэй, кандыдат багаслоўя (1990), дацэнт (2000). Ён змяшчае ў сваёй асобе навукоўца і клірыка. Нарадзіўся 4 сакавіка 1959 г. у в. Дзівін. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў (1976), Маскоўскую духоўную акадэмію (1986). Працаваў настаўнікам Маскоўскай духоўнай семінарыі. З 1989 г. працуе ў Мінскай духоўнай семінарыі, дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі, дацэнт кафедры багаслоўскіх дысцыплін факультэта тэалогіі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

**Гордун** Сяргей Аляксандравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. – Мінск, 2002. - С. 432.

**Гапанович, А. Н.** Сергей Алексеевич Гордун / Афанасий Гапанович // Дивин — древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 70. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Гардун** Сяргей Аляксеевіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 27-29.

**Вядомыя** людзі, ураджэнцы в. Дзівін. Гардун Сяргей Аляксеевіч // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 36.

## 115 гадоў з дня нараджэння А. В. Грышкоўскага *(1904)*

**Грышкоўскі Аляксей Васільевіч** - генерал-маёр (1945). Нарадзіўся 10 мая І904 г. у в. ***Мярніца***. Закончыў Ваенную акадэмію імя Дзяржынскага (1940). З 1918 г. у Чырвонай арміі. Вялікую Айчынную вайну пачаў пад Ленінградам камандзірам артылерыйскага палка ў чыне маёра. Удзельнічаў у вызваленні Украіны, у баях у Польшчы, Чэхаславакіі. Вайну закончыў у Германіі камандуючым артылерыяй 18-й арміі ў чыне генерал-маёра. Пасля вайны камандуючы артылерыяй арміі, намеснік камандуючага артылерыяй ваеннай акругі, начальнік факультэта Артылерыйскай радыётэхнічнай акадэміі імя Говарава, дырэктар саўгаса «3-і рашаючы» пад Харкавам. Памёр 5 сакавіка 1990 г.

**Грышкоўскі** Аляксей Васільевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

## 95 гадоў з дня нараджэння М. П. Грома *(1924)*

**Гром Мікалай Пятровіч** нарадзіўся 14.12.1924 г. у в. ***Ліпава***. Закончыў Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча. У Вялікую Айчынную вайну са снежня 1943 г. партызанскі сувязны, потым у партызанскай брыгадзе «За Радзіму» імя Флегантава. З лета 1944 г. у Чырвонай арміі. Удзельнічаў у вызваленні гарадоў Брэст, Ратна (Украіна), Гдыня, Торунь (Польшча) і інш. Дзень Перамогі сустрэў у Берліне.

**Гром** Мікалай Пятровіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 241. – (Крутымі дарогамі вайны).

## 75 гадоў з дня нараджэння Г. Р. Гулюка *(1944)*

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** - дзяржаўны дзеяч, кандыдат сельскагаспадарчых навук. Нарадзіўся 23 ліпеня 1944 г. у в. ***Дварэц (Яромічы)***. Закончыў Горэцкую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў прарабам у Яроміцкай МТС, начальнікам ПМК у г. Маларыта, намеснікам міністра, міністрам меліярацыі СССР. У наш час Г. Г. Гулюк працуе дырэктарам Дэпартамента меліярацыі і тэхнічнага забеспячэння Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі. Ён віцэ-прэзідэнт Міжнароднай камісіі па ірагацыі і дрэнажу, член калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ. Георгій Рыгоравіч Гулюк з’яўляецца дзяржаўным саветнікам РФ 2 класа. Г. Р. Гулюк узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За преобразование Нечерноземья РСФСР» і 8 медалямі. Заслужаны меліяратар Расійскай Федэрацыі.

**Гулюк** Георгій Рыгоравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Гулюк** Георгій Рыгоравіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 32-33.

## 55 гадоў з дня нараджэння Л. В. Дарошак *(1964)*

**Дарошак Любоў Васільеўна** – дацэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, спецыяліст па менеджменту. Выпускніца 1964 года сярэдняй школы № 1 г. Кобрына. Скончыла школу з залатым медалём і ў той жа год паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння ўніверсітэта была размеркавана на работу ў навукова-даследчы інстытут пры Дзяржплане БССР. Потым практычна ўсё жыццё Л. Дарошак (з 1974 года па 2007 год) звязана з выкладаннем у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі (цяпер Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт). Прайшла шлях ад асістэнта да дацэнта ўніверсітэта.

З 2007 года Л. В. Дарошак працуе ў Прыватным інстытуце кіравання і прадпрымальніцтва.

**Дорошек, Л. В**. Основы менеджмента : учебно-практическое пособие / Л. В. Дорошек [и др.]. – Минск : БГЭУ, 2004.

**Дарошак** Любоў Васільеўна // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 36-37.

## 55 гадоў з дня нараджэння М. М. Дземідовіча *(1964)*

**Дземідовіч Мікалай Мікалаевіч** нарадзіўся 17.12.1964 г. у в. ***Гарадзец*** Кобрынскага раёна. У 1982 г. закончыў Гарадзецкую сярэднюю школу, дапрызыўную падрыхтоўку прайшоў у Брэсцкай аўташколе ДТСААФ. У кастрычніку 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан. 25 снежня 1984 г. Мікалай загінуў. Узнагароджаны медалём. Пахаваны на могілках в. Гарадзец.

**Дземідовіч** Мікалай Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 444–445. – (Загінулі ў Афганістане).

## 100 гадоў з дня нараджэння А. І. Дзеравянкі *(1919)*

**Дзеравянка Андрэй Іванавіч** нарадзіўся 31.10.1919 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года да мая 1945 г. на фронце. Камандзір 669-га стралковага палка маёр А. І. Дзеравянка ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Дзеравянка** Андрэй Іванавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 235. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 75 гадоў з дня нараджэння Р. Г. Запарожчанка *(1944)*

**Запарожчанка Раіса Георгіеўна** - вучоны-фізік, доктар фізіка-матэматычных навук. Нарадзілася 25 лютага 1944 года ў в. ***Мярніца*** Кобрынскага раёна. У 1966 годзе скончыла фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1977 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці квантавая электроніка. Р. Г. Запарожчанка надрукавала больш за 100 навуковых артыкулаў у айчынных і замежных часопісах, атрымала 9 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы. Па выніках гэтых даследаванняў у 1996 годзе ёй прысвоена навуковая ступень доктара фізіка-матэматычных навук па спецыяльнасці лазерная фізіка. Раіса Георгіеўна -

вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава Нацыянальнай АН Беларусі.

**Запарожчанка** Раіса Георгіеўна // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 434-435. – (Імі ганарацца землякі).

**Запарожчанка** Раіса Георгіеўна // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 45-46.

## 120 гадоў з дня нараджэння О. Зарыскага *(1899)*

**Зарыскі Оскар** (сапраўдныя імя і прозвішча Ошэр Зарыцкі; англ. Oscar Zariski; 24.04.1899, Кобрын – 4.07.1986, Бруклайн, штат Масачусец, ЗША) - амерыканскі матэматык. Нарадзіўся 24 красавіка 1899 года ў г. ***Кобрыне***. У 1927 годзе О. Зарыскі эмігрыруе ў ЗША, дзе працуе ва ўніверсітэце Джона Хопкінса, затым у Гарвардскім універсітэце. Асноўныя працы вучонага ў галіне алгебры. О. Зарыскі выказаў знакамітую гіпотэзу аб уласцівасцях алгебраічных многачленаў (Гіпотэза Зарыскага).У 1944 годзе геніяльны матэматык быў удастоены прэміі Коўла за выдатны ўклад у алгебру. У 1965 годзе Зарыскага ўзнагародзілі Нацыянальным навуковым медалём ЗША, які прысуджаецца Прэзідэнтам краіны. Оскар Зарыскі - лаўрэат прэміі Вольфа за 1981 год. 4 ліпеня 1986 года вялікага матэматыка не стала.

**Касцюковіч, М. М.** Зарыскі Оскар / М. М. Касцюковіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1. – С. 388.

**Зарыскі** Оскар // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 46-48.

## 115 гадоў з дня нараджэння Б. Р. Ільясюка *(1904)*

**Ільясюк Барыс Рыгоравіч** нарадзіўся 24.07.1904 г. у в. ***Пецькі***. Удзельнічаў у рэва-люцыйнай барацьбе. Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў настаўнікам, інспектарам раёна, дырэктарам дзіцячай тэхнічнай школы Кобрына. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце. З 1943 г. працаваў у Саўнаркоме Удмурцкай АССР. У 1944 г. вярнуўся ў Кобрын. З 1948 г. старшыня, з 1959 г. сакратар Кобрынскага гарвыканкама. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, 9 медалямі. Памёр у 1989 г.

**Ільясюк** Барыс Рыгоравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 242, 452.

## 95 гадоў з дня нараджэння З. Кабаты *(1924)*

**Кабата Збігнеў** (17.03.1924 - 04.07.2014) - брытанскі і канадскі паразітолаг, доктар біялагічных і філасофскіх навук, ганаровы член Паразіта-лагічнага грамадства. Нарадзіўся 17 сакавіка 1924 года ў в. ***Яромічы*** Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскага раёна) у сям'і афіцэра. У 1966 годзе З. Кабаце прысвоена званне доктара біялагічных і філасофскіх навук. Кабата прысвяціў больш 50 гадоў працы па сістэматыцы і цыклам паразітычных капепод. Як прызнанне заслуг Кабаты, яго імем названа некалькі дзясяткаў марскіх істот. З. Кабата адзначаны шматлікімі медалямі за прафесійную і грамадскую дзейнасць, сярод якіх узнагароды Канадскага грамадства заолагаў, Польскага паразіталагічнага грамадства. 4 чэрвеня 2014 года Збігнеў Кабата пайшоў з жыцця.

**Доктор** Збигнев Кабата // Паразитология. – 2015. – Т. 49. В. 1. – С. 72-74. – Паразитологическое общество.

**Кабата Збігнеў** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 57-58.

## 105 гадоў з дня нараджэння А. М. Караваева *(1914)*

**Караваеў Аляксандр Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1914 г. у в. Танкавічы Сяроўскага раёна Свярдлоўскай вобласці, Расія. З ліпеня 1940 г. служыў у складзе 182-га асобнага сапёрнага батальёна на тэрыторыі Літвы. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны з баямі адыходзіў на ўсход, трапіў у палон. Уцёк. У 1942-1944 гг. у партызанскім атрадзе імя Катоўскага, намеснік камандзіра атрада па разведцы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. З ліпеня 1944 г. да ліпеня 1946 г. працаваў старшынёй Дзівінскага райвыканкама. У канцы 1946 г. выехаў на Урал.

**Караваеў** Аляксандр Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 125 гадоў з дня нараджэння Д. А. Каранчука *(1894)*

**Каранчук Даніла Аляксеевіч** нарадзіўся 21.12.1894 г. у в. ***Лягаты***. У гады грамадзянскай вайны ваяваў пад Рыгай, у цэнтральных раёнах і на поўдні Расіі. У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у фарміраванні маршавых рот, быў намеснікам камандзіра часці па гаспадарчых пытаннях у г. Пугачоў Саратаўскай вобласці (Расія). Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. вярнуўся ў Кобрын. З 1947 г. дырэктар харчкамбіната, працаваў у гархарчгандлі, райгандлі, загадчыкам райсабеса, архіварыусам. Памёр 18.04.1986 г.

**Каранчук** Даніла Аляксеевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. -С. 242-243. – (Крутымі дарогамі вайны).

## 95 гадоў з дня нараджэння П. Р. Каранчука *(1924)*

**Каранчук Павел Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. ***Магдалін.*** З 1948 г. працаваў старшынёй калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна, які быў у ліку тых гаспадарак, на базе якіх праводзіліся рэспубліканскія семінары па сельскай гаспадарцы. Першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў бываў у гэтай гаспадарцы неаднаразова. Будучы пенсіянерам, актыўна працаваў у ветэранскіх арганізацыях, быў старастай вёскі Магдалін. У 1985 годзе Павел Рыгоравіч захапіўся тапанімікай. У мясцовай газеце "Кобрынскі веснік" апублікаваны шэраг артыкулаў пад рубрыкай "Деревенька моя". У час падрыхтоўкі, збору матэрыялаў і выдання кнігі "Памяць. Кобрынскі раён" Каранчук П. Р. прымаў актыўны ўдзел у яе выданні. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», іншымі ўзнагародамі. Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна.

**Долготович, Б. Д**. Коренчук Павел Григорьевич / В. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 30-31.

**Каранчук** Павел Рыгоравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Павел** Григорьевич Коренчук // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Павел** Григорьевич Коренчук : [биографический очерк]: альбом. – Магдалин, 2003. - 19 с. : фото.

## 115 гадоў з дня нараджэння М. П. Карповіча *(1904)*

**Карповіч Максім Пятровіч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. ***Асмолавічы***. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенныя гады калгаснік, брыгадзір паляводчай брыгады ў калгасе «Шлях Леніна» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966).

**Карповіч** Максім Пятровіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

## 110 гадоў з дня нараджэння Х. М. Касымава *(1909)*

**Касымаў Хамза Мірсайхавіч** нарадзіўся ў 1909 г. у в. Ахметава, Башкірыя. У гады Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1942 г. да сакавіка 1943 г. намеснік камандзіра палка 16-й Башкірскай кавалерыйскай дывізіі. З мая 1943 г. да ліпеня 1944 г. партызан атрада імя Катоўскага, у маі - ліпені 1944 г. камісар атрада. Са снежня 1944 г. да мая 1945 г. у Чырвонай арміі, камандзір палка. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны жыў у г. Уфа.

**Касымаў** Хамза Мірсайхавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 180 гадоў з дня нараджэння І. А. Катовіча *(1839)*

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** (1839 - 1915) – вядомы праваслаўны царкоўны дзеяч, гісторык, публіцыст, журналіст і фалькларыст. Магістр багаслоўя (1873). Іван Катовіч, старэйшы сын протаіерэя Антонія Ануфрыевіча Катовіча, нарадзіўся ў 1839 годзе ў в. ***Чаравачыцы*** Кобрынскага павета Гродзенскай губерніі. Атрымаў адукацыю ў Кобрынскім духоўным вучылішчы. Скончыў Літоўскую духоўную семінарыю, Пецярбургскую духоўную акадэмію. Выкладаў у Кобрынскім і Віленскім духоўных вучылішчах, Віленскім рэальным вучылішчы. З 1875 года ён протаіерэй, настаяцель Віленскага Прачысценскага сабора. У 1869-1903 гг. І. А. Катовіч - рэдактар «Литовских епархиальных ведомостей», у якіх змясціў шмат артыкулаў па царкоўных пытаннях. Іван Антонавіч быў членам Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства. І. А. Катовіч даследаваў гісторыю распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі, праваслаўных храмаў Кобрына, Вільні.

**Катовіч** Іван (Іаан) Антонавіч // Асветнікі зямлі Беларускай : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 223.

**Котович** Иван (Иоанн) Антонович // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 505-506.

**Чарапіца, В.** Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч / Валерый Чарапіца // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 149.

**Катовіч** Іван (Іаан) Антонавіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 65-66.

## 100 гадоў з дня нараджэння У. М. Кірмановіча *(1919)*

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** - Герой Савецкага Саюза (1945), палкоўнік (1958). Нарадзіўся 5.11.1919 г. у ***Кобрыне***. Закончыў курсы малодшых лейтэнантаў (1942), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1955). У Вялікую Айчынную вайну з мая 1942 г. на Бранскім, Цэнтральным, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Камандзір знішчальнай процітанкавай батарэі капітан У. М. Кірмановіч вызначыўся пры вызваленні Латвіі. 22 жніўня 1944 г. у час танкавай контратакі праціўніка ў раёне пас. Букайшы Добельскага раёна батарэя на чале з У. М. Кірмановічам першая прыняла ўдар, падбіла і спаліла 6 танкаў, 3 самаходныя гарматы, што спрыяла паспяховаму наступленню савецкіх войскаў. За гэты подзвіг У. М.

Кірмановіч быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. З 1960 г. выкладчык Харкаўскага ваенна-авіяцыйнага вучылішча імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца. Да 1974 г. у Савецкай арміі. На будынку кобрынскай СШ № 2, у якой вучыўся У. М. Кірмановіч, установлена мемарыяльная дошка. 12 кастрычніка 2005 г. было прынята рашэнне аб прысваенні ў г. Кобрыне вуліцы імя Кірмановіча. Ганаровы грамадзянін г. Кобрына. Памёр у 2001 годзе.

**Долготович, Б. Д.** Кирманович Владимир Николаевич / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 30.

**Залатая** зорка Кобрына. Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 239.

**Кирманович** Владимир Николаевич // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси. – Мінск, 2010. – С. 516-517.

**Кирманович** Владимир Николаевич // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 454.

**Кирманович** Владимир Николаевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. – Минск, 2007. - Т. 4. – С. 48.

**Кірмановіч У. М.** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972 . - Т. 5. –
С. 590 : фота.

**Владимир** Николаевич Кирманович // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## 55 гадоў з дня нараджэння М. М. Кірысюка *(1964)*

**Кірысюк Міхаіл Мікалаевіч** - малодшы сяржант. Нарадзіўся 7.09.1964 г. у в. ***Хабовічы*** Кобрынскага раёна. У 1979 г. закончыў Хабовіцкую васьмігадовую школу, у 1980 г. - ПТВ № 102 г. Кобрына, пасля працаваў у ПМК № 70. У маі 1983 г. прызваны ў рады Савецкай арміі, служыў у Беларускай ваеннай акрузе. У верасні 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан у якасці камандзіра аддзялення. Памёр 1.03.1984 г. Пахаваны на могілках в. Хабовічы.

**Кірысюк** Міхаіл Мікалаевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 445. – (Загінулі ў Афганістане).

**Кірысюк** Міхаіл Мікалаевіч // Памяць. Афганістан. –Мінск, 1991. - С. 207 : фат.

## 70 гадоў з дня нараджэння С. М. Кірычука *(1949)*

**Кірычук Сцяпан Міхайлавіч** – кандыдат тэхнічных навук (1999), доктар сацыялагічных навук, дацэнт, ганаровы прафесар Цюменскай

дзяржаўнай архітэктурна-будаўнічай акадэміі, сапраўдны член Муніцыпальнай акадэміі Расійскай Федэрацыі. Нарадзіўся 18 мая 1949 года ў вёсцы ***Мазуры*** Кобрынскага раёна. Скончыў Брэсцкі чыгуначны тэхнікум, Уральскі электрамеханічны інстытут чыгуначнага транспарту. Займаў кіраўнічыя пасады ў Цюменскім абкаме КПСС. Пасля распаду СССР чатырохразова абіраўся мэрам Цюмені на прамых усенародных выбарах. У наш час С. І. Кірычук - старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па пытаннях мясцовага самакіравання, член камісіі Савета Федэрацыі па натуральных манаполіях, прадстаўнік ад выканаўчага органа дзяржаўнай улады Цюменскай вобласці. Сцяпан Міхайлавіч - аўтар шматлікіх навуковых прац. Узнагароджаны медалем «За освоение недр и развитие нефтегазового комплекса Западной Сибири» (1981), ордэнам Дружбы народаў (1986), ордэнам «За заслуги перед Отечеством» IV ступені (2010), Ганаровай граматай Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі

**Кірычук** Сцяпан Міхайлавіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 71.

**Кто** есть кто. Киричук Степан Михайлович [Электронный ресурс] // Деловой Петербург. – Режим доступа: http://whoiswho. dp.ru/cart/ person/ 1930889/. – Дата доступа: 18.09.2017.

## 100 гадоў з дня нараджэння В. Р. Коўтуна *(1919)*

**Коўтун Васіль Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1919 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце са снежня 1941 г., служыў старшыной дывізіёна ў 60-м гвардзейскім Кобрынскім артылерыйскім палку. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі.

**Коўтун** Васіль Рыгоравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 235. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 110 гадоў з дня нараджэння Р. М. Кошаля *(1909)*

**Кошаль Рыгор Міхайлавіч** нарадзіўся ў 1909 г. у г. Смалявічы Мінскай вобласці. У кастрычніку 1939 г. працаваў у Кобрыне на пасадзе галоўнага бухгалтара міжраённай канторы «Белгандальплодаагародніна». У 1942 г. устанавіў сувязь з партызанамі, у 1943 г. пайшоў у партызанскі атрад імя Катоўскага, быў старшым дыверсійнай групы. У 1944 г. разам з атрадам выйшаў за лінію фронту.

**Кошаль** Рыгор Міхайлавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 221. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 140 гадоў з дня нараджэння П. А. Крачэўскага *(1879)*

**Крачэўскі Пётр Антонавіч** (7 жніўня 1879 г. – 8 сакавіка 1928 г.) – гісторык, беларускі палітычны і грамадска-культурны дзеяч, паэт, драматург. Дэлегат І Усебеларускага Кангрэсу, Прэзідэнт Рады БНР. Нарадзіўся 7 жніўня 1879 года ў Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні ў сям'і дыякана вясковай царквы. У эміграцыі, у Празе, П. Крачэўскі стварыў прадстаўніцтва Рады БНР, разгарнуў шырокую дыпламатычную дзейнасць Ён удзельнік Першай Усебеларускай палітычнай канферэнцыі ў Празе-Чэшскай у верасні 1921 года. Пётр Антонавіч Крачэўскі выявіў сябе як здольны публіцыст, гісторык і паэт. Памёр 8 сакавіка 1928 года.

**Крачэўскі (Крэчэўскі)** Пётр Антонавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1999. - Т. 8. - С.470.

**Крачэўскі** (Крэчэўскі) Пётр Антонавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. – Мінск, 2012. – Т. 4. – С. 567.

**Мазец, В.** Крачэўскі Пётр Анонавіч / Валянцін Мазец // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 256.

**Памяткі** нашай мінуўшчыны. Пётр Крачэўскі // Берасцейскія карані : гісторыка-краязнаўчы і літаратурны зборнік. – Брэст, 1993. – С. 97.

**Крачэўскі** Пётр Антонавіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 77-79.

## 70 гадоў з дня нараджэння М. А. Крывецкага *(1949)*

**Крывецкі Мікалай Анатольевіч** нарадзіўся 5 красавіка 1949 г. у в. Малінаўка Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці . У 1975-1985 гг. інструктар Драгічынскага райкама КПБ, намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Драгічынскага райвыканкама, інструктар, намеснік загадчыка сельскагаспадарчага аддзела Брэсцкага абкама, другі сакратар Маларыцкага райкама КПБ, старшыня Іванаўскага райвыканкама. У 1985-1991 гг. першы сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. З сакавіка да снежня 1991 г. - намеснік старшыні Савета калгасаў Брэсцкай вобласці. У апошні час кіраўнік Адміністрацыі свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншымі ўзнагародамі.

**Крывецкі** Мікалай Анатольевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскіага раёна. – Мінск, 2002. - С. 453. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

## 80 гадоў з дня нараджэння В. У. Курашыка *(1939)*

**Курашык Віталій Уладзіміравіч** - акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, Ганаровы доктар Міжнароднай кадравай акадэміі. Нарадзіўся Віталій Курашык 8 мая 1939 года ў в. ***Дзівін***. З 1982 года жыве ў Крыму. У 1982-1985 гг. старшыня гарвыканкама г. Еўпаторыя (Крым). У 1985-1987 гг. - загадчык аддзела Крымскага абкама КПУ, у 1987-1991 гг. - намеснік старшыні, першы намеснік старшыні, старшыня Крымскага аблвыканкама. У 1991-1993 гг. В. У. Курашык - старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Крым. З мая 1993 г. па 14 чэрвеня 2001 г. - Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне. З 1999 года - дуайен дыпкорпуса. З 2001 года - першы віцэ-прэзідэнт Міжрэгіянальнай Акадэміі кіравання персаналам. З 2003 года- саветнік Прадстаўніка Прэзідэнта ААТ «Лукойл» на Украіне. За сваю дзейнасць у Украіне і Беларусі В. У. Курашык узнагароджаны ордэнамі «Працоўнага Чырвонага Сцяга» і «За заслугі» III ступені (Украіна), а таксама ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Кабінета Міністраў Украіны і іншымі ўзнагародамі. Віталій Уладзіміравіч Курашык - Ганаровы грамадзянін г. Еўпаторыя. У 2010 годзе выйшла кніга В. У. Курашыка «Я не хочу судьбу иную…(Записки дипломата)», у якой ён шмат старонак прысвяціў сваёй малой радзіме в. Дзівін.


**Курашик** Виталий Владимирович // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 517.

**Курашык** Віталь Уладзіміравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. – Мінск, 2002. - С. 437 : фота.

**Гапанович, А. Н.** Виталий Владимирович Курашик / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 72, 73. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Шпакова, Н. В**. Курашик Віталій / Н. В. Шпакова // Українська дипломатична енциклопедія : у 2-х т. – Киев : Знання України, 2000. - Т. 1.

**Курашык** Віталь Уладзіміравіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 83-85.


## 115 гадоў з дня нараджэння Д. К. Курышкі *(1904)*

**Курышка Дзмітрый Кузьміч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. ***Балоты***. Удзельнічаў у арганізацыі партызанскіх атрадаў. З ліпеня 1943 г. да ліпеня 1944 г. партызан-разведчык атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны працаваў у Кобрыне. Памёр у 1984 годзе.


**Курышка** Дзмітрый Кузьміч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 222. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### 100 гадоў з дня нараджэння М. М. Ламейкі *(1919)*

**Ламейка Міхаіл Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1919 г. у в. Вішнёўка Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. З верасня 1942 г. Міхаіл Мікалаевіч баец атрадаў імя Шчорса і «Савецкая Беларусь», з красавіка 1943 г. да красавіка 1944 г. - партызанскага атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Пасля вайны працаваў у паравозным дэпо Брэста. Трагічна загінуў 17.02.1977 г.

**Ламейка** Міхаіл Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 222. (Змагаліся ў тыле ворага).

### 85 гадоў з дня нараджэння В. Л. Леанюка *(1934)*

**Леанюк Віктар Лук'янавіч** нарадзіўся 3 снежня 1934 г. у в. Гнеўчыцы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. З 1957 г. інструктар Іванаўскага райкама, Брэсцкага абкама, у 1959-1962 гг. - першы сакратар Кобрынскага райкама ЛКСМБ, потым інструктар Кобрынскага райкама КПБ. У 1963-1969 гг. старшыня Кобрынскага гарвыканкама. З 1969 г. па 1975 г. намеснік дырэктара Кобрынскага СПТВ № 102. Затым працаваў у сістэме будаўніцтва ў Беларусі і Расіі, удзельнічаў у асваенні Нечарназем'я РСФСР. Выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета. Мае ўрадавыя ўзнагароды СССР. На пенсіі з 1994 г. Жыве ў Мінску.

**Леанюк** Віктар Лук'янавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 453. - (Яны кіравалі горадам і раёнам).

### 55 гадоў з дня нараджэння С. П. Лесняка *(1964)*

**Лясняк Сяргей Пятровіч** - радавы, вадзіцель бронетранспарцёра. Нарадзіўся 3.11.1964 г. у ***Кобрыне***. У 1979 г. закончыў 8 класаў Кобрынскай сярэдняй школы № 6. У маі 1983 г. быў прызваны ў Савецкую армію ў Туркестанскую ваенную акругу. У кастрычніку 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан у якасці вадзіцеля БТР. Загінуў 7.11.1983 г. Узнагароджаны медалём. Пахаваны на могілках горада Кобрына.

**Лясняк** Сяргей Пятровіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 446. – (Загінулі ў Афганістане).

### 115 гадоў з дня нараджэння Е. П. Лукіной *(1904)*

**Лукіна Ефрасіння Пятроўна** нарадзілася 7 ліпеня 1904 г. у Віцебску. Закончыла Мінскую вышэйшую сельскагаспадарчую школу (1936). З 1939 г. інструктар Брэсцкага абкама КП(б)Б, з 1941 г. дырэктар МТС у Саратаўскай вобл. (Расія). З 1943 г. знаходзілася ў рэзерве аператыўнай групы ЦК КП(б)Б у Маскве. У ліпені 1944 г. - кастрычніку 1946 г. сакратар Кобрынскага

райкама КП(б)Б. У 1946-1959 гг. на гаспадарчай рабоце ў Кобрыне. Выбіралася дэпутатам Кобрынскага гарадского Савета.

**Лукіна** Ефрасіння Пятроўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002.- С. 453. - (Яны кіравалі горадам і раёнам).

## 95 гадоў з дня нараджэння М. М. Любіменка *(1924)*

**Любіменка Міхаіл Мікалаевіч** - Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся 29.4.1924 г. у с. Новаандрэеўка Арэхаўскага раёна Запарожскай вобл. На фронце з 1942 года, ваяваў у 37-м гвардзейскім Кобрынскім стралковым палку 12-й стралковай дывізіі. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Вызначыўся 17 красавіка 1945 г. Намеснік камандзіра батальёна разам з батальёнам першы пераправіўся цераз р.Одэр, захапіў плацдарм, замацаваўся на ім, адбіў 6 контратак праціўніка, забяспечыў пераправу ўсіх падраздзяленняў палка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 31.05.1945 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Да 1969 г. служыў у Савецкай арміі, падпалкоўнік.

**Любіменка** Міхаіл Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 232-233. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 95 гадоў з дня нараджэння А. К. Мазурына *(1924)*

**Мазурын Анатоль Кузьміч** нарадзіўся 16.01.1924 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. З ліпеня 1941 г. служыў старшым тэлеграфістам у 37-м гвардзейскім стралковым палку, удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Мазурын** Анатоль Кузьміч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002.- С. 236. - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 115 гадоў з дня нараджэння Д. К. Малькова *(1904)*

**Малькоў Дзмітрый Кузьміч** - Герой Савецкага Саюза (1944), генерал-лейтэнант (1955). Нарадзіўся 8.11.1904 г. у в. Лаўрухіна Савецкага раёна Кіраўскай вобласці. У Чырвонай арміі з 1927 г. Палкоўнік Д. К. Малькоў, камандзір 12-й гвардзейскай Пінскай стралковай дывізіі ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Да 1960 г. служыў у Савецкай арміі.

**Малькоў** Дзмітрый Кузьміч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 233. - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 115 гадоў з дня нараджэння А. М. Мартынава *(1904)*

**Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** нарадзіўся 20 жніўня 1904 г. у ***Кобрыне.*** У 1911-1915 гг. вучыўся ў Кобрынскім прыходскім вучылішчы. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР з 24.09.1939 г. прыцягнуты на працу ў Часовае ўпраўленне Кобрынскага павета для наладжвання работы пошты. 1 лістапада 1939 г. прызначаны загадчыкам гарадской бібліятэкі. У Вялікую Айчынную вайну быў сувязным партызанскага атрада імя Чапаева. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад акупантаў аднаўляў работу бібліятэкі. 4 жніўня 1946 г. прызначаны дырэктарам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава. Пад яго кіраўніцтвам музей стаў адным з лепшых у Беларусі, дзе сабраны унікальныя калекцыі зброі, нумізматыкі. А. М. Мартынаў удзельнічаў у грамадскім жыцці Кобрыншчыны: арганізаваў раённае аддзяленне Таварыства аховы прыроды, Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Вёў вялікую краязнаўчую работу. Ім напісана больш за 70 артыкулаў, якія публікаваліся ў рэспубліканскіх і мясцовых органах друку. Ганаровы грамадзянін г. Кобрына. Узнагароджаны медалём імя Н. К. Крупскай. Памёр 15.11.1999 г.

**Долготович, Б. Д.** Мартынов Алексей Михайлович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. - С. 31.

**Мартынаў** Аляксей Міхайлавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 437-438. – (Імі ганарацца землякі).

**Краязнавец** з Вялікай літары : біябібліяграфічны паказальнік / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук. - Кобрын, 2014. – 48 с.

## 105 гадоў з дня нараджэння Ф. І. Маскаленка *(1914)*

**Маскаленка Фёдар Ільіч** нарадзіўся ў 1914 г. у в. Водзіна Данецкай вобласці, Украіна. У верасні 1941 г. удзельнічаў у стварэнні партызанскіх атрадаў, у т. л. атрада імя Чапаева, адным з камандзіраў якога ён быў. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрынскім раёне. З 1952 г. быў старшынёй калгаса «1 Мая», пазней працаваў старшынёй сельсавета. Памёр у верасні 1960 г.

**Маскаленка** Фёдар Ільіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 216. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 90 гадоў з дня нараджэння К. І. Мельнікавай *(1929)*

**Мельнікава Кіра Іванаўна** нарадзілася ў 1929 г. у г. Лепель Віцебскай вобласці. У 1949 г. закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча. Працавала настаўніцай у няпоўнай СШ в. Запруды, загадчыцай школы ў в. Перкі, настаўніцай пачатковых класаў у кобрынскіх сярэдніх школах № 3,2,5. Званне “Заслужаны настаўнік “ прысвоена ў 1965 г.

**Мельнікава** Кіра Іванаўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

## 95 гадоў з дня нараджэння Н. І. Місюк *(1924)*

**Місюк Надзея Іосіфаўна** нарадзілася ў 1924 г. у в. Брылёва. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызанка атрада імя А. В. Суворава Пінскага злучэння. З 1944 г. па 1951 г. сакратар Кісялевіцкага сельсавета. З 1951 г. звеннявая, а з 1957 г. брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

**Місюк** Надзея Іосіфаўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск : БЕЛТА, 2002.- С. 428. – (Вызначыліся працай).

## 100 гадоў з дня нараджэння С. М. Міхальчышына *(1919)*

**Міхальчышын Савелій Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1919 г. на Украіне. З 1941 г. лейтэнант С. М. Міхальчышын служыў у Брэсцкай крэпасці пры штабе, потым прызначаны камандзірам кулямётнай роты. Вайну сустрэў у Брэсцкім гарнізоне. Удзельнік вызвалення Кобрына. З 1944 г. у дзеючай арміі, вызваляў Кёнігсберг. Пасля вайны служыў у органах унутраных спраў у гарадах Брэсце, Кобрыне. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступеней, медалямі.

**Міхальчышын** Савелій Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 237. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 95 гадоў з дня нараджэння М. А. Назарука *(1924)*

**Назарук Міхаіл Аляксеевіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Боркі Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну спачатку быў партызанскім сувязным, з чэрвеня 1943 г. стралок партызанскага атрада імя Чкалава (са студзеня 1944 г. атрада імя Паставалава брыгады імя Чапаева). Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны ІІ ступені, медалямі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у Астроміцкім сельсавеце, на хлебазаводзе.

**Назарук** Міхаіл Аляксеевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 237. -(Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 115 гадоў з дня нараджэння М. М. Несцярука *(1904)*

**Несцярук Максім Мікітавіч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. ***Павіцце***. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўключыўся ў падпольную барацьбу. З 1942 г. да 1943 г. быў сувязным партызанскіх атрадаў імя Шчорса і імя Катоўскага. Загінуў у кастрычніку 1943 г.

**Несцярук** Максім Мікітавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002.- С. 223. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 60 гадоў з дня нараджэння М. А. Новіка *(1959)*

**Новік Мікалай Аляксеевіч** нарадзіўся 22 красавіка 1959 г. у в. ***Астромічы*** Кобрынскага раёна. У 1970-1976 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І. В. Ахрэмчыка на мастацкім аддзяленні. Член Саюза дызайнераў Беларусі (1991). Займаецца дызайнам асяроддзя, абсталявання, графічным дызайнам. Сярод асноўных работ - праекты школы мастацтваў саўгаса «Днепра-Бугскі» Кобрынскага раёна, абсталявання для вучэбнай майстэрні малюнка і жывапісу, дзіцячага паркавага атракцыёну. Працуе і як жывапісец у жанры пейзажу і нацюрморта. Працы М. А. Новіка знаходзяцца ў прыватных мастацкіх калекцыях у Англіі, Германіі, Канадзе, Польшчы, ЗША, Францыі і іншых краінах.

**Новік** Мікалай Аляксеевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 439-440. – (Імі ганарацца землякі).

## 100 гадоў з дня нараджэння І. Ц. Разумоўскага *(1919)*

**Разумоўскі Іван Ціханавіч** нарадзіўся 23.01.1919 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны паступіў у ваеннае вучылішча ў Маскве. Вайну пачаў 22 чэрвеня 1941 г. у складзе курсанцкай роты вучылішча, якая неўзабаве была накіравана на заходнюю граніцу СССР. Служыў у 533-м армейскім Кобрынскім знішчальным процітанкавым артылерыйскім палку, удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Вайну закончыў у маі 1945 г. камандзірам знішчальнай процітанкавай батарэі ў званні капітана. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны І і ІІ ступеней, медалямі.нагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Разумоўскі** Іван Ціханавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна.- Мінск, 2002.- С. 237. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 95 гадоў з дня нараджэння М. А. Салея *(1924)*

**Салей Мікалай Андрэевіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. ***Балоты***. Закончыў Ленінградскае ваенна-палітычнае вучылішча (1952) і гістарычны факультэт Гомельскага педінстытута (1954). У маі 1943 г. стаў падрыўніком партызанскага атрада імя Катоўскага. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў М. А. Салей быў прызваны ў Чырвоную армію, потым накіраваны на працу ў органы НКУС. У 1959-1976 гг. працаваў дырэктарам школы ў в. Кісялёўцы Кобрынскага раёна. Узнагароджаны медалямі.

**Салей** Мікалай Андрэевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 225. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 35 гадоў з дня нараджэння М. Серадовіча *(1984)*

**Серадовіч Мікалай** - спартсмен. Нарадзіўся ў 1984 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы, прызёр юніёрскіх чэмпіянатаў свету ў 2001 г. (Германія), 2002 г. (Ямайка).

**Серадовіч** Мікалай // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 441. - (Імі ганарацца землякі).

## 55 гадоў з дня нараджэння І. Ф. Сідарука *(1964)*

**Сідарук Ігар Фёдаравіч** нарадзіўся ў ***Кобрыне*** 23 ліпеня 1964 года ў сям'і служачых. Тут закончыў школу, пазней - філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ў 1986 г. З 1993 года загадчык літаратурна-драматычнай часткі ў Брэсцкім абласным тэатры лялек. Ігар Сідарук выступае ў драматургіі і паэзіі, піша для дзяцей. У 1992 г. у калектыўным зборніку «Драўляны рыцар» (выдавецтва «Юнацтва») была апублікавана яго п'еса для дзяцей «Кветкі пад ліўнем». У гэтым жа годзе аўтар выдае кнігу вершаў «Чарнабел», у 1994 г. - паэтычны зборнік «Сатана Арганата» і дзіцячую кніжку «Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука». Ён - аўтар п'ес «Галава», «Прыгоды Люстрынкі», «Меч Анёла», «Збавіцель», «Дрэва багоў», «Плач, саксафон!. ».,  «Янка-зух і нячысты дух», «Штукатуры», «Белая дама» і іншых, пастаўленых у розных тэатрах Беларусі. За сцэнарый спектакля «Залатая табакерка» атрымаў Гран-пры на міжнародным тэатральным фестывалі «Белая вежа-2001» у Брэсце.

**Ігар** Сідарук // Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст, 2008. – С. 315-316.

**Сідарук** Ігар Фёдаравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 441. – (Імі ганарацца землякі).

**Ляшук, В. Я.** Сідарук Ігар / В. Я. Ляшук // Літаратура Берасцейшчыны / Ляшук В. Я., Снітко Г. М. - Брэст, 1999. - С. 364-366.

**Ігар** Сідарук. “Іншым разам радок дыктуе само неба…” : біябібліяграфічны паказальнік / УК “Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка”, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын, 2014. - 28 с.

**Ігар** Сідарук: рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік / аддзел абслугоўвання і інфармацыі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. – Кобрын, 2002. – 4 с.

## 110 гадоў з дня нараджэння П. С. Сідарук *(1909)*

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** нарадзілася ў 1909 г. у в. ***Ілаўск*** у сялянскай сям’і. З 1927 г. член КСМЗБ, з 1931 г. - КПЗБ. У кастрычніку 1939 г. была выбрана дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны апынулася ў Паволжжы, пазней была закінута ў Кобрынскі раён для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. Была членам бюро Антопальскага падпольнага райкама КП(б)Б, які знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Кірава. Пасля вайны працавала сакратаром Кобрынскага райкама партыі, пазней намеснікам старшыні Кобрынскага райвыканкама. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР у 1947-1951 гг. Ганаровая грамадзянка горада Кобрына.

**Долготович, Б. Д.** Сидорук Прасковья Семёновна / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Сідарук** Праскоўя Сямёнаўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскіага раёна. – Мінск, 2002. - С. 455. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

## 110 гадоў з дня нараджэння Ф. Н. Сідзюка *(1909)*

**Сідзюк Фама Ніканавіч** нарадзіўся ў 1909 г. у в. ***Турная***. З 1934 г. сакратар ячэйкі КПЗБ у роднай вёсцы, з 1935 г. падраённы сакратар КПЗБ Турнянскага ўчастка. У 1936 г. арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены ў Бяроза-Картузскі канцлагер. У 1937 г. вызвалены, аднак зноў арыштаваны. Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР (верасень 1939) працаваў у Кобрынскім гархарчгандлі. З 1941 г. у Чырвонай арміі, быў накіраваны ў Тамбоў (Расія), да 1945 г. служыў у савецкім тыле. Пасля Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў у Кобрыне. Памёр у 1991 годзе.

**Сідзюк** Фама Ніканавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 115. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне (1921-1939).

## 70 гадоў з дня нараджэння І. В. Соўпеля *(1949)*

**Соўпель Ігар Васільевіч** - беларускі вучоны, спецыяліст у галіне інфарматыкі. Доктар тэхнічных навук (1991), прафесар (1994). Нарадзіўся 8 красавіка 1949 года ў в. ***Гарадзец*** Кобрынскага раёна. Закончыў матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971). Працаваў у Інстытуце матэматыкі АН БССР. З 1981 года ён дацэнт, з 1997 года Ігар Васільевіч загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК факультэта прыкладной матэматыкі БДУ. І. В. Соўпель з'яўляецца навуковым кіраўніком лабараторыі інтэлектуальных інфармацыйных сістэм. Навуковец з'яўляецца аўтарам шэрагу вынаходніцтваў у галіне штучнага інтэлекту, якія запатэнтаваны ў міжнародных патэнтных фондах. Ігар Васільевіч з'яўляецца членам Навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 1999 годзе ўзнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

**Соўпель** Ігар Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. – С. 91.

**Совпель** Игорь Васильевич // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 279.

**Совпель** Игорь Васильевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 16 – 17.

**Соўпель** Ігар Васільевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. – Мінск, 2002.- С. 442.

**Соўпель** Ігар Васільевіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 134-135.

## 85 гадоў з дня нараджэння А. З. Старыкавай *(1934)*

**Старыкава Анастасія Зоцікаўна** нарадзілася ў 1934 г. у в. ***Лелікава.*** З 1949 г. працавала ў калгасах «Чырвоная Зорка» Кобрынскага раёна, імя Лесі Украінкі Валынскай вобласці (Украіна), саўгасах «Нежынскі» Какчатаўскай вобласці (Казахстан) і «Патрыкі» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна (1971).

**Старыкава** Анастасія Зоцікаўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскіага раёна. – Мінск, 2002. - С. 428. – (Вызначыліся працай).

## 80 гадоў з дня нараджэння А. С. Стоцкага *(1939)*

**Стоцкі Аляксей Сямёнавіч** нарадзіўся ў 1939 г. у в. ***Стрыгава***. Пасля службы ў радах Савецкай арміі стаў працаваць трактарыстам у калгасе імя Дзімітрава Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Стоцкі** Аляксей Сямёнавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002.- С. 428. - (Вызначыліся працай).

## 100 гадоў з дня нараджэння В. В. Сцёцкіна *(1919)*

**Сцёпкін Валянцін Васільевіч** нарадзіўся ў 1919 г. у Кобрынскім раёне. З верасня 1943 г. баец партызанскага атрада імя Чапаева. З лістапада 1943 г. палітрук роты, са студзеня 1944 г. камісар атрада імя Малянкова, з мая 1944 г. начальнік штаба партызанскай брыгады імя Чапаева. Пасля вызвалення Кобрынскага раёна накіраваны на савецкую работу ў Косаўскі раён Брэсцкай вобласці. Узнагароджаны медалямі.

**Сцёпкін** Валянцін Васільевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. -С. 217. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 90 гадоў з дня нараджэння М. М. Суботы *(1929)*

**Субота Міхаіл Максімавіч** нарадзіўся ў 1929 г. у в. Лозкі Пружанскага раёна. Пасля службы ў радах Савецкай арміі і заканчэння Пінскага вучылішча механізацыі працаваў камбай-нерам у Яроміцкай МТС, а з 1958 г. трактарыстам у калгасе імя Мічурына Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), медалём.

**Субота** Міхаіл Максімавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 428. - (Вызначыліся працай).

## 95 гадоў з дня нараджэння Я. І. Тураўца *(1924)*

**Туравец Якаў Іванавіч** нарадзіўся 7.11.1924 г. у г. Петрыкаў Гомельскай вобласці. У пачатку 1940 г. разам з сям'ёй прыехаў у Брэст для аднаўлення Дняпроўска-Бугскага канала. З 1943 г. -партызан, разведчык атрада імя Катоўскага Брэсцкага партызанскага злучэння. З красавіка 1944 г. у Чырвонай арміі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны закончыў ваеннае вучылішча, пазней ваенную акадэмію, інжынер-палкоўнік, выкладчык ВНУ.

**Туравец** Якаў Іванавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002.- С. 226. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 95 гадоў з дня нараджэння П. П. Фацеева *(1924)*

**Фацееў Пётр Піліпавіч** нарадзіўся ў 1924 г. у Маскве. З верасня 1943 г. разведчык партызанскага атрада імя Катоўскага, прымаў і апрацоўваў зводкі Саўінфармбюро. З мая 1944 г. да кастрычніка 1946 г. служыў у Чырвонай арміі. Пасля дэмабілізацыі закончыў Маскоўскі энергетычны інстытут, працаваў загадчыкам аддзела вымярэнняў і вымяральнай тэхнікі пры інстытуце. Узнагароджаны медалямі.

**Фацееў** Пётр Пілiпавiч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 226. - (Змагаліся ў тыле ворага).

## 115 гадоў з дня нараджэння А. І. Федасюка *(1904)*

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** - дзяржаўны дзеяч. Нарадзілася 17 жніўня 1904 г. у в. ***Андронава.*** З 1926 г. член Кобрынскага падпольнага райкама, з 1928 г. член Брэсцкага падпольнага акруговага камітэта КПЗБ. У кастрычніку 1931 г. - сакавіку 1932 г. сакратар Навагрудскага акруговага камітэта КПЗБ. У 1929 - 1937 гг. сакратар ЦК КСМЗБ. З мая 1934 г. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. дэпутат Народнага сходу Заходняй Беларусі, член яго паўнамоцнай камісіі на сесіі Вярхоўнага Савета СССР. Са студзеня 1940 г. на савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну ў партызанах - сакратар Дзівінскага падпольнага райкама, член бюро Брэсцкага падпольнага абкама КП(б)Б. У 1944-1957 гг. сакратар Брэсцкага, Маладзечанскага гаркамаў КПБ, загадчык аддзела ЦК КПБ. Дэлегат I (1928), II (1935) з'ездаў КПЗБ, кангрэса КІМа (1933). Узнагароджана ордэнамі Леніна і Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Федосюк** Александра Ивановна // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 433.

**Федасюк** Аляксандра Іванаўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 443-444. – (Імі ганарацца землякі).

## 35 гадоў з дня нараджэння М. А. Ціханавай *(1984)*

**Ціханава Марына Аркадзьеўна** - спартсменка. Нарадзілася ў 1984 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы. Прызёр чэмпіянатаў свету сярод юніёраў у 1999 г. (Польшча) і ў 2002 г. (Ямайка).

**Ціханова** Марына Аркадзьеўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 444. - (Імі ганарацца землякі).

## 85 гадоў з дня нараджэння А. І. Шымко *(1934)*

**Шымко Аляксей Іванавіч** нарадзіўся ў 1934 г. у г. ***Кобрыне.*** Закончыў факультэт станкавага жывапісу завочнага народнага ўніверсітэта мастацтваў імя Крупскай (1959), мастацкі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна факультэт ТГВМ (1964). Алейны жывапіс і акварэль у стылі наіўнага рэалізму. Стваральнік тонкага лірычнага Кобрынскага краявіда.

**Шымко** Аляксей Іванавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 526. – (Кобрынскія мастакі на мяжы стагоддзяў).

## 60 гадоў з дня нараджэння У. М. Чыквіна *(1959)*

**Чыквін Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1959 г. у г. Высокае Камянецкага раёна. Закончыў мастацкі факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (1985). Працаваў выкладчыкам і майстрам разьбы па дрэву ў ПТВ-105 народных мастацкіх промыслаў, выкладчыкам на мастацкам факультэце Брэсцкага педагагічнага ўніверсітэта. Алейны жывапіс і графіка у рэалістычным стылі ў традыцыі віцебскай мастацкай школы. У скульптуры развівае формаўтваральныя традыцыі 20-х гадоў XX ст.. З 2004 г. з'яўляецца членам Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, у 2005 годзе выбраны старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза майстроў.

**Чыквін** Уладзімір Мікалаевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 526. - (Кобрынскія мастакі на мяжы стагоддзяў).

## 95 гадоў з дня нараджэння Ф. Ф. Швайко *(1924)*

**Швайко Фёдар Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. ***Стрыі***. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў семнаццацігадовым узросце стаў сувязным партызанскіх груп. З сакавіка 1943 г. у атрадзе імя Чапаева, са студзеня 1944 г. у брыгадзе імя Чапаева, спачатку радавы, потым камандзір аддзялення узвода, апошнія паўгода перад расфарміраваннем брыгады - камандзір роты. Удзельнік вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. У ліпені 1944 г. накіраваны на працу ў аддзел міліцыі Кобрына. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Швайко** Фёдар Фёдаравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002.- С. 227. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 105 гадоў з дня нараджэння А. К. Шварцкопфа *(1914)*

**Шварцкопф Аляксей Карлавіч** нарадзіўся ў 1914 г. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Даслужыўся да камандзіра 2-й батарэі 533-га армейскага знішчальнага процітанкавага артылерыйскага палка. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Шварцкопф** Аляксей Карлавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 239. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

# Юбілейныя даты рэлігійных устаноў

## Аляксандра-Неўскі кафедральны сабор у г. Кобрыне *(1864)- 155 гадоў*

**Сабор Аляксандра Неўскага -** галоўная праваслаўная святыня Кобрына. Закладзены ў гонар адмены прыгоннага права і ўзведзены ў 1864-1868 гг. на месцы брацкай магілы рускіх салдат, загінуўшых падчас Кобрынскага бою 15 ліпеня 1812 года. Помнік архітэктуры позняга класіцызму. Аляксандра-Неўскі сабор уваходзіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.


**Кобрынскі** Сабор Аляксандра Неўскага // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 519.

**Кобринский** собор Александра Невского // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 480.

**Кулагін, А. М.** Свята-Александра-Неўскі Сабор / А. М. Кулагін // Праваслаўныя храмы Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск, 2001. – С. 101-102.

**Петросова, Е. Ю**. Собор Александра Невского / Е. Ю. Петросова // Свод памятников истории и культуры Белорусии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 250, 251.

**Пятросава, А. Ю**. Кобрынскі сабор Аляксандра Неўскага / А. Ю. Пятросава // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. - С. 371.

**Сабор** Аляксандра Неўскага (архіт.) // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / АН БССР ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал.: С. В. Марцалеў [і інш.]. – Мінск, 1984. – С. 226.

**Свята-Аляксандра-Неўскі** сабор // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 461. – (Праваслаўнае мураванае дойлідства).


## Царква ў імя святога архангела Міхаіла ў в. Бародзічы *(1999) - 20 гадоў*

**Царква ў імя святога архангела Міхаіла** ў в. Бародзічы пабудавана з дрэва ў 1999 годзе на месцы папярэдняга драўлянага храма XIX ст.


**Царква** ў імя святога архангела Міхаіла // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 44. : каляр. фота.

## Свята-Крыжаўзвіжанская царква ў в. Бяроза *(1864)* - *155 гадоў*

**Свята-Крыжаўзвіжанская царква** знаходзілася на паўднёвай ускраіне вёскі Бяроза на вуліцы Савецкай. Пабудавана ў 1864-1867 гг. на месцы праваслаўнага храма, які згарэў. Помнік мае рысы стылю класіцызму. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Бярозаўская** Крыжаўзвіжанская царква // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 2. – С. 163.

**Свята-Крыжаўзвіжанская** царква ў в. Бяроза // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 465, 466. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

## Свята-Успенская царква ў в. Тэўлі *(1874)* - *145 гадоў*

**Свята-Успенская царква** – помнік архітэктуры сінадальнага накірунку рэтраспектыўна-рускага стылю. Пабудавана ў 1874 годзе ў в. Тэўлі з цэглы паводле праекта архітэктара Міхалоўскага. Царква дзейнічае, уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята-Успенская** царква ў в. Тэўлі // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 462. – (Праваслаўнае мураванае дойлідства).

## Свята-Пакроўская царква ў в. Хабовічы *(1899)* – *120 гадоў*

**Свята-Пакроўская царква** размешчана ў цэнтры в. Хабовічы. Пабудавана ў 1899 годзе на ўрадавыя сродкі на месцы ранейшага храма. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята-Пакроўская** царква ў в. Хабовічы // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 466, 467. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

# Юбілейныя даты прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна

## 80 гадоў з часу стварэння Пракуратуры Кобрынскага раёна *(1939)*

***Пракуратура*** Кобрыншчыны бярэ пачатак з верасня 1939 года. Пасля вызвалення Кобрынскага раёна ў ліпені 1944 г. пракурорам раёна быў прызначаны юрыст I класа А. В. Лукоўкін. У тыя гады ў штаце пракуратуры

практычна не было супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй, на працу прыходзілі былыя франтавікі, якія скончылі трохмесячныя юрыдычныя курсы і працягвалі завочнае навучанне. Уклад ва ўмацаванне законнасці ў раёне ўнеслі праку-рорскія работнікі Кобрыншчыны Якіменкаў В. І., Міжэўскі І. С., Маеўскі І. А., Капітан В. С., Пархачук А. А., Амельянюк В. В., Сцепанюк Е. М., Запарошчанка М. І., Петрасюк А. І. і іншыя. Пракуратура Кобрынскага раёна забяспечвае нагляд за законнасцю дзеянняў следчага апарата, работы міліцыі, абгрунтаванасці прымаемых рашэнняў суда.

**Петросюк, А.** На страже законности и правопорядка / [Александр Петросюк ; беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2017. - 24 чэрвеня. - С. 4.

**Петросюк, А**. «Справедливость в правосудии должна стоять на первом месте» : к 95-летию органов прокуратуры Беларуси / Александр Петросюк // Кобрин-информ. - 2017. - 22 июня. - С. 6.

**Пракуратура** пераехала // Народная трыбуна. – 2009. – 12 верасня. – С. 3. - 7 верасня пракуратура раёна справіла наваселле ў будынку былой шахматнай школы па вуліцы Савецкай.

## 80 гадоў з часу стварэння Аддзела ўнутраных спраў Кобрынскага райвыканкама *(1939)*

Міліцыя Брэстчыны, у тым ліку Кобрыншчыны, бярэ пачатак з верасня 1939 г. пасля ўз'яднання заходніх абласцей Беларусі з Беларускай ССР. 2 лістапада 1939 г. загадам народнага камісарыята ўнутраных спраў СССР у ліку іншых створаны Кобрынскі павятовы аддзел міліцыі. Яго першым начальнікам быў прызначаны Міхаіл Ісмакаў. Слаўны і гераічны шлях прайшла кобрынская міліцыя. Актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам, злачыннасцю прымалі першыя ўчастковыя інспектары А. І. Ратайка, К. П. Тур, М. І. Барздун. Гераічны шлях у гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў участковы М. М. Шаўчук, які за мужнасць і гераізм быў узнагароджаны 12 ордэнамі і медалямі. У 90-я гады XX ст. сярод лепшых супрацоўнікаў Кобрынскага ГРАУС : оперупаўнаважаныя аддзела крымінальнага вышуку Ю. П. Дзядзюк, П. М. Магуйла, нам. начальніка АБЭЗ Г. П. Ператолчын, оперупаўнаважаныя АБЭЗ А. У. Макарук, В. В. Вішнеўскі, участковыя інспектары С. В. Цімашчук, А. А. Кананчук, М. Ф. Ігнацюк і інш. У лістападзе 2009 г. Кобрынскі раённы аддзел унутраных спраў адзначыў сваё 70-годдзе, у гэты ж дзень адбылося адкрыццё новага будынка РАУС.

**Дубина, Л.** Общественному порядку - пристальное внимание / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2017. - 26 ліпеня. - С. 2.

**Степанюк, В.** Путь длиною в сотню лет / Владимир Степанюк // Кобрин-информ. - 2017. - 2 марта. - С. 4. - История образования Кобринского районного отдела внутренних дел.

**Суббота, М. А.** Кобринскому РОВД – 75 лет. Из истории становления Кобринского РОВД / М. А. Суббота // Кобрин-информ. – 2014. – 30 октября. – С. 4-5.

**Рекуц, С.** «Форменное» новоселье / Сергей Рекуц // Заря. – 2009. – 10 ноября. – С. 2. - 5 ноября состоялась церемония открытия нового здания Кобринского РОВД.

**Савчук, М.** С юбилеем, милиция Кобринщины! / М. Савчук // Кобрин-информ. - 2009. - 5 ноября. - С. 4 ; Народная газета. - 2009. - 5 лістапада. – С. 2.

## 75 гадоў з часу стварэння Кобрынскага раённага ваеннага камісарыяту *(1944)*

Гісторыя ***Кобрынскага раённага ваеннага камісарыяту*** пачынаецца з 18 ліпеня 1944 года. На аснове загаду Камандуючага Беларускай ваеннай акругай № 0347 і дырэктывы Брэсцкага абласнога ваеннага камісарыята быў сфарміраваны Кобрынскі раённы ваенны камісарыят. У сувязі з пераходам на новы штат у красавіку 1963 г. ён перайменаваны ў Кобрынскі аб’яднаны гарадскі ваенны камісарыят, які ў той час быў у складзе Беларускай ваеннай акругі, а ў 1992 годзе ўвайшоў у склад Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. У працэсе рэфарміравання Узброеных Сіл 1 верасня 2002 г. Кобрынскі аб'яднаны гарадскі ваенны камісарыят быў пераведзены на новы штат і зноў перайменаваны ў Кобрынскі раённы ваенны камісарыят. Асноўныя крытэрыі работы Кобрынскага ваеннага камісарыята - гатоўнасць да правядзення мабілізацыі людскіх і транспартных рэсурсаў на тэрыторыі раёна ў мірны і ваенны час, а таксама стан улікова-прызыўнай працы ў ваенкамаце, якаснае правядзенне мерапрыемстваў па тэрытарыяльнай абароне.

**Круглов, И.** Кобринский РВК – лучший в области / [Игорь Круглов ; беседовала] Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. - 17 июля. - С. 3. - Военный комиссар полковник И. Круглов – о деятельности местного органа военного управления.

**Круглов, И. В.** И снова призыв / И. В. Круглов, [беседовала Маргарита Савчук] // Кобрин-информ. – 2012. – 29 марта. - Кобринский комиссариат возглавил подполковник И. В. Круглов.

## 80 гадоў з часу заснавання Адкрытага акцыянернага таварыства (ААТ) «Кобрынскі масларобча-сыраробчы завод» *(1939)*

***Кобрынскі масласыраробчы завод*** заснаваны ў 1939 годзе як маслазавод. Пасля Вялікай Айчыннай вайны рэканструяваны. У 1967 г. пабудаваны новы завод, магутнасць якога была разлічана на перапрацоўку 50 т малака за змену. У 1989 г. уступіў у строй цэх сухога абястлушчанага малака. У 1997 г. завод набыў статус адкрытага акцыянернага таварыства. Пастаўшчыкамі з’яўляюцца гаспадаркі і прыватны сектар Кобрынскага

раёна. Сёння завод, які вядзе адлік сваёй гісторыі з 1939 года, - сучаснае высокатэхналагічнае прадпрыемства. Пакупнікі любяць прадукцыю завода за тое, што яна натуральная і ўтрымлівае мінімум розных стабілізатараў і дабавак. Кобрынскія сыры з'яўляюцца асновай асартыменту і своеасаблівай візітнай карткай ААТ «Кобрынскі МСЗ». Акрамя сыру выпускаецца каля 130 найменняў натуральнай малочнай прадукцыі. Ёсць у кобрынскага прадпрыемства перамогі на рэспубліканскіх конкурсах, ганаровы дыплом «Лепшая кампанія СНД», дыпломы «Лепшы прадукт года», за перамогу ў конкурсах «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» і «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі» і г. д.

**Адкрытае** акцыянернае таварыства «Кобрынскі масласыраробчы завод» // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 412-413.

**Всегда** только лучшее! // Брестчина, устремлённая в будущее. – Брест, 2009. – С. 274-275. - ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод».

**Кобринский** маслодельно-сыродельный завод // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 100.

**Корбут, В.** ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод» 70 лет (1939-2009) : справочное издание / Вячеслав Корбут. – Минск : Друк-С, 2010. – 183 с.

**Мисюк, Н. С.** Кобринский маслодельно-сыродельный завод / Н. С. Мисюк // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1.- С. 472-473.

## 65 гадоў з часу заснавання Адкрытага акцыянернага таварыства (ААТ) «Кобрынскі хлебазавод» *(1954)*

***Кобрынскі хлебазавод*** заснаваны ў 1954 годзе. У 1959 г. пабудаваны булачны цэх, у 1962 годзе - склады для сыравіны, кацельня. У 1970 г. завод газіфікаваны. У 1992 г. уведзены ў строй новыя вытворчыя магутнасці. Кобрынскі хлебазавод – самае маладое пякарнае прадпрыемства ў Брэсцкай вобласці, якое ўваходзіць у склад РУВП «Брэстхлебпрам». Сёння асартымент прадукцыі налічвае больш сарака найменняў хлебабулачных і ста найменняў кандытарскіх вырабаў у год. На прадпрыемстве ўвесь час укараняюцца новыя тэхналогіі.

**Кобрынскі** хлебазавод // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 410.

**Хомук, А. П.** Кобринский хлебозавод / А. П. Хомук // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. -  С. 482.

## **60 гадоў з часу заснавання Адкрытага акцыянернага таварыства «Кобрынскі льнозавод» *(1959)***

***Кобрынскі льнозавод*** быў уведзены ў эксплуатацыю ў 1959 годзе. Завод перапрацоўваў льносыравіну з гаспадарак Кобрынскага, Драгічынскага, Пружанскага і Маларыцкага раёнаў Брэсцкай вобласці. Меў адну паточную лінію. У 1962 г. пабудаваны ўчастак прамысловай перапрацоўкі льносаломкі, у 1965 г. устаноўлена 2-я паточная лінія па вырабе льновалакна. У 1972 годзе ўступіў у строй участак па вырабе кастрапліт. У 1997 г. пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае таварыства. Асноўным напрамкам дзейнасці ААТ «Кобрынскі льнозавод» з'яўляецца першасная апрацоўка льну і выраб доўгага і кароткага льновалакна.

**Адкрытае** акцыянернае таварыства «Кобрынскі льнозавод» // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002.- С. 412. – (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

## **75 гадоў з часу заснавання Адкрытага акцыянернага таварыства (ААТ) «Швейная фірма «Лона» *(1944)***

Заснавана ў 1944 г. як швейная майстэрня-арцель «Сацпраца». Арцелі было перададзена некалькі трафейных швейных машын фірмы «Зінгер». Да вясны 1945 г. выраблялa прадукцыю для фронту. У 1956 г. арцель перададзена Міністэрству лёгкай прамысловасці БССР і перайменавана ў швейную фабрыку. Працавала 256 чалавек. Пашывачны асартымент - касцюмы для дзяцей з баваўняных і шарсцяных тканін. У 1961-1966 гг. праведзена рэканструкцыя фабрыкі, у 1967 г. пабудаваны новы вытворчы корпус. Колькасць рабочых узрасла да 1300 чалавек. З 1972 г. пачалося асваенне новага асартыменту - куртак спартыўна-бытавога прызначэння для ўсіх узроставых груп. У 1993 г. Кобрынская швейная фабрыка стала арэндным прамыслова-гандлёвым прадпрыемствам «Лона», у 1994 г. перайменавана ў Кобрынскую швейную фірму «Лона». З 2001 года РУП «Швейная фірма «Лона». Прадпрыемства славіцца выпускам канкурэнтаздольных швейных вырабаў. Член Беларускай гандлёва-прамысловай палаты (з 1969). На працягу шэрагу гадоў фірма «Лона» супрацоўнічае з фірмамі Францыі, Расіі, Вялікабрытаніі па пашыву швейных вырабаў на ўзаемавыгадных умовах. ААТ «Швейная фірма «Лона» выпрабляе шырокі асартымент мужчынскай, жаночай і дзіцячай адзежы.

**Андреюк, З. В.** Кобринская швейная фирма «Лона» // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 467-468.

**Кобрынская** швейная фабрыка «Лона» // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 411.

**Андреюк** Зинаида Васильевна, директор ОАО «Швейная фирма «Лона» // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Женщины Беларуси. – Минск, 2011. - Т. 1. – С. 11.

## 75 гадоў з часу заснавання Адкрытага акцыянернага таварыства (ААТ) «Кобрын-тэкстыль» *(1944)*

***Вытворча-гадлёвая фірма «Сузор'е»*** заснавана ў 1944 г. як арцель «Чырвоны Сцяг». Рабочыя (каля 20 жанчын) уручную апрацоўвалі авечую воўну, на ўласных калаўротах пралі пражу, вязалі світэры, валялі валёнкі. У 1949 г. установлены ручныя ткацкія станкі. Прадпрыемства выпускала радно, дарожкі для падлогі, хусткі. З 1950 г. пачалі ткаць абрусы, з 1951 г. дываны, з 1953 г. жакардавыя пакрывалы. Працавала каля 120 чалавек. Значны ўклад у развіццё арцелі ўнеслі першы дырэктар П. Я. Алесік і першы мастак М. Д. Іванова. У 1957 г. пабудаваны ткацкі цэх, у 1958 г. з'явіліся механічныя станкі. У 1960 г. перайменавана ў фабрыку «Чырвоны Сцяг». У 1963 г. заменены апошні ручны ткацкі станок. Асноўным асартыментам сталі жакардавыя пакрывалы. У 1968 г. уведзены ў строй новы ткацкі цэх і складскія памяшканні, у 1969 г. - фарбавальны цэх. На базе ткацкай фабрыкі ў 1979 г. створана тэкстыльна-вытворчае аб'яднанне, у склад якога ўвайшлі Антопальская ватна-прадзільная фабрыка і Дзівінскі ўчастак. З 1983 г. у сувязі з абнаўленнем абсталявання пашырыўся асартымент вырабаў, пачалі выпускаць паўтара- і двухспальныя пакрывалы, шарсцяныя камплекты, пледы і пражу, махровыя ручнікі, дэкаратыўныя тканіны. З 1995 г. сучасная назва. У 1998-2000 гг. расшыраны асартымент дэкаратыўных і асвоены выраб тэхнічных тканін. У 1999 г. выраблена 253 тыс. кв. м баваўняных і 328 тыс. кв. м шаўковых тканін. «Кобрын-тэкстыль» з'яўляецца адным з нешматлікіх прадпрыемстваў у РБ па выпуску прадукцыі хатняга тэкстылю. За актыўны ўдзел і высокія дасягненні ў вобласці якасці ААТ «Кобрын-тэкстыль» узнагароджана мноствам дыпломаў.

**Андреюк, В. В.** «Кобрин-текстиль» / В. В. Андреюк // Республика Беларусь : энциклопедия: [в 7 т.] - Минск, 2007. – Т. 4. – С. 103.

**Бондарук, Л. А.** «Кобрин-текстиль» / Л. А. Бондарук // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 483.

**Вытворча**-гадлёвая фірма «Сузор'е» // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 411.

## 80 гадоў з часу стварэння Дзяржаўнай вопытнай лесагаспадарчай установы «Кобрынскі вопытны лясхоз» *(1939)*

***Кобрынскі лясгас*** быў створана ў 1939 годзе. У 2000 г. яму быў прысвоены статус вопытнага лясгаса. На дадзены момант у склад ДВЛГУ

«Кобрынскі вопытны лясгас» уваходзяць дзесяць структурных падраздзяленняў: Балоцкае лясніцтва, Верхалескае лясніцтва, Дзівінскае вопытна-вытворчае лясніцтва, Запрудскае лясніцтва, Засімоўскае лясніцтва, Пятровіцкае лясніцтва, Павіццеўскае лясніцтва, Дзівінскі цэх перапрацоўкі драўніны, Засімоўскі базісны лесагадавальнік, Лесапункт.

**Кобринский** опытный лесхоз. 70 лет. История и современность / автор текста, подбор материалов В. Корбут. – Минск : Логвинов, 2011. – 196 с. : цв. фото.

**Кобрынскі** лясгас // Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984. - Т. 3. – С. 50.

**Кулик, А. А.** Кобринский опытный лесхоз / А. А. Кулик // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 474-475.

## 80 гадоў Кобрынскай раённай ветэрынарнай станцыі *(1939)*

Дзякуючы актыўнай рабоце сучаснага кіраўніцтва ўстановы з дапамогай архіўных дакументаў была вызначана яе дата нараджэння – 29 верасня 1939 года. Спачатку ветэрынарня (старая назва ўстановы) размяшчалася па вуліцы Рэвалюцыйнай, 14, у 1940 годзе прапісалася па новым адрасе: Чырвонаармейская, 82, дзе знаходзіцца і зараз. Паводле архіўных дакументаў вядома, што ў 1940 годзе старшым ветэрынарным урачом быў таварыш Скотніцкі, а яго намеснікам – Фадзей Прарок. Сёння ў склад лячэбна-прафілактычнай установы ўваходзяць участковыя ветэрынарныя лячэбніцы ў вёсках Пецькі, Навасёлкі, Кісялёўцы, Дзівін, Павіцце, Гарадзец, Андронава. Зона абслугоўвання кожнага ўчастка – 18-20 вёсак. Функцыянуюць дзве лабараторыі: дыягнастычная і аграхімічная, ёсць і ўласны віварый, дзе ўтрымліваюцца жывёлы для эксперыментальнай работы.

**Дубіна, Л.** На дапамогу «братам нашым меншым» / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. – 2014. – 8 кастрычніка. – С. 3. - Кобрынскай раённай ветэрынарнай станцыі – 75 гадоў.

**Гром, А**. Сохранить и приумножить: / Анна Гром // Кобрынскі веснік. – 2010. – 20 лістапада. – С. 3. - Кобринская районная ветеринарная станция.

**Сацук, А.** Кобринские ветеринары лучшие в республике / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 2008. – 31 мая. – С. 2.

## 75 гадоў з часу стварэння КУШВП ЖКГ «Кобрынская ЖКГ» *(1944)*

Кобрынская камунальная гаспадарка ўтворана 01.08.1944 г. загадам выканаўчага камітэта Кобрынскага гарадскога савета дэпутатаў працоўных ад 05.08.1944 № 4. У 1965 г. быў створаны Кобрынскі камбінат камунальных прадпрыемстваў. Рашэннем Брэсцкага абласнога выканкама

№ 361 ад 21.05.1984 г. Кобрынскі камбінат камунальных прадпрыемстваў з 01.06.1984 г. перайменаваны ў Кобрынскае гарадское вытворчае аб'яднанне жыллёва-камунальнай гаспадаркі.
З 15.03.2001 г. Кобрынскае гарадское вытворчае аб'яднанне жыллёва-камунальнай гаспадаркі перайменавана ў камунальнае ўнітарнае шматгаліновае вытворчае прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Кобрынская ЖКГ». Асноўным напрамкам працы КУШВП «Кобрынская ЖКГ» з'яўляецца аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву, прадпрыемствам і арганізацыям горада і раёна.

**Сортировка** мусора по-европейски // Кобрин-информ. - 2017. - 21 сентября. - С. 2. - Благодаря совместному проекту ЕС/ПРООН в Кобринском ЖКХ произошло усовершенствование существующей системы обращения с твердыми бытовыми отходами.

**Казакова , А.** Они в ответе за наш город / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. - 24 марта. - С. 3. - В канун профессионального праздника - о работе КУМПП ЖКХ «Кобринское ЖКХ».

## Установе «Рэдакцыя раённай газеты «Кобрынскі веснік» *(1939)* – 80 гадоў
## Праграме радыёвяшчання «Кобрынскае раённае радыё» *(1964) – 55 гадоў*

Раённая газета ў Кобрыне выдаецца з верасня 1939 года. Спачатку называлася «Труд», з 1953 г. - «Праца», са студзеня 1963 г. - «Камуністычная праца», з 1991 г. - «Кобрынскі веснік». З чэрвеня 1941 па жнівень 1944 газета не выдавалася. Выходзіць 2 разы ў тыдзень на беларускай і рускай мовах. У структуру рэдакцыі «Кобрынскі веснік» уваходзіць і «Кобрынскае раённае радыё».

**Астаповіч, А.** На ўсё жыццё / Аркадзь Астаповіч // Нашчадкам слова застаецца. – Брэст, 2001. - С. 81-82. - Аб газеце «Кобрынскі веснік».

**Гісторыя** газетным радком. Па старонках кобрынскай раённай газеты // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 421-426.

**«Камуністычная** праца», газета, орган Кобрынскага РК КПБ і раённага Савета народных дэпутатаў // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1980. – Т. 3. - С. 258.

**«Камуністычная** праца», газета, орган Кобринского РК КПБ и районного Совета народных депутатов // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1980. – Т. 3. - С. 250.

**Куцэра, Г. Д.** Карэспандэнты «Камуністычнай працы» / Г. Д. Куцэра // Раённая ў пошуку. - Мінск, 1974. – С. 81-82.

**Пянко, А. М.** «Кобрынскі веснік» / А. М. Пянко // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 484.

**Пянко, А. М.** Кобринское районное радио / А. М. Пянко // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 483.

### 80 гадоў Кобрынскаму раённаму вузлу паштовай сувязі *(1939)*

Гісторыя Кобрынскага раённага вузла паштовай сувязі бярэ пачатак у 1939 годзе, калі паводле загада № 1 ад 15 кастрычніка была ўтворана Кобрынская павятовая паштова-тэлеграфная кантора сувязі. Прайшлі гады… Цяпер пошта – гэта найбуйнейшая сацыяльна-накіраваная структура, якая аказвае не толькі паслугі сувязі, але і больш 30 выглядаў нетрадыцыйных паслуг.

**Мартынаў, А. М.** Кобрынская пошта / А. М. Мартынаў // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 417-419.

**Курига, Е**. Когда праздников сразу два / Елена Курига // Кобрин-информ. - 2009. - 8 октября. - С. 2. - Районный узел почтовой связи отметил 70-летие со дня образования уездной почтово-телеграфной конторы связи.

## Юбілейныя даты медыцынскіх устаноў

### 75 гадоў з часу стварэння Установы аховы здароўя «Кобрынская цэнтральная раённая бальніца» *(1944)*

На падставе загаду загадчыка Кобрынскага райаддзела аховы здароўя № 1 ад 1944/07/26 года была створана бальніца ў г. Кобрыне, якая з'яўлялася самастойнай медыцынскай установай на 180 ложкаў. У жніўні 1948 г. ў склад бальніцы ўвайшлі: паліклініка, жаночая і дзіцячая кансультацыі, раддом і была прысвоена назва - Бальнічна-Паліклінічнае аб'яднанне Кобрынскай раённай бальніцы, якое праіснавала да жніўня 1956 г. З жніўня 1956 г. у складзе Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы функцыянавалі: санэпідэмічны аддзел, супрацьтуберкулёзны і скурна-венералагічны дыспансеры, 5 участковых бальніц, 3 участковыя амбулаторыі, 10 пунктаў аховы здароўя, станцыя хуткай дапамогі, 3 дзіцячых ясляў, 38 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, дзіцячая бальніца і Дзівінская туберкулёзная бальніца. У 1973 г. пабудаваны новы корпус цэнтральнай раённай бальніцы на 400 ложкаў. Рашэннем выканаўчага камітэта Кобрынскага Савета народных дэпутатаў ад 1989/12/29 года № 358 Кобрынская цэнтральная раённая бальніца перайменавана ў Кобрынскае тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне. Рашэннем Кобрынскага райвыканкама ад 2001/03/27 года № 138 Кобрынскае тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне перайменавана ва ўстанову аховы здароўя «Кобрынскае ТМА». У 2007 годзе праведзена

рэканструкцыя будынка былога прафілакторыя пад паліклініку Кобрынскай ЦРБ, што дазволіла палепшыць умовы працы медыцынскага персаналу і значна скараціць чэргі пацыентаў. Мадэрнізаваны будынак інфекцыйнага аддзялення цэнтральнай раённай бальніцы.

**Мартынаў, А. М**. З гісторыі аховы здароўя на Кобрыншчыне / А. М. Мартынаў // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 134-136.

**Пашковіч, Л.** Медыкі адзначылі прафесіянальнае свята / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. - 21 чэрвеня. - С. 3. - У сістэме Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы працуе каля 1900 чалавек, з якіх 280 урачоў.

**Наши** медики - третьи в области! // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 лютага. — С. 2. - УЗ «Кобринская центральная районная больница» заняла почетное третье место по итогам работы районных медицинских учреждений за 2016 г.

**Белов, Д.** А начиналось с самого необходимого... / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2015. — 14 студзеня. — С. 4. - История центральной районной больницы берёт свое начало с 1944 года.

## 75 гадоў з часу стварэння Дзяржаўнай установы (ДУ) «Кобрынскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» *(1944)*

Гісторыя станаўлення санітарнай службы Кобрынскага раёна сыходзіць у далёкі 1944 год, калі на падставе загада № 29 ад 10 снежня 1944 г. па Кобрынскаму раённаму аддзелу аховы здароўя і загада абласнога аддзела аховы здароўя ад 7 снежня 1944 г. прыступіў да выканання абавязкаў начальніка санэпідстанцыі Гіхерман Пётр Язэпавіч. У мэтах актывізацыі барацьбы і прафілактыкі сыпнога тыфу ў 1948 г. у Кобрынскай санэпідстанцыі ствараецца эпідэмічны аддзел, у склад якога ўваходзяць 2 дэзінфектара, 1 дезінструктар, 1 вакцынатар. 7 снежня 1948 г. у Кобрынскай санэпідстанцыі ствараецца лабараторыя. У ліпені 1956 г. па распараджэнні абласнога аддзела аховы здароўя адбылося аб’яднанне раённага аддзела па ахове здароўя, санстанцыі і іншых медустаноў раёна. Загадам упраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама № 249 ад 04.12.2002 г. ДУ «Кобрынскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» пераіменаваны ў ДУ «Кобрынскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі». ДУ «Кобрынскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» з'яўляецца цэнтрам 1 катэгорыі сельскага раёна. У зону абслугоўвання Кобрынскага ЗЦГЭ з улікам занальнага прынцыпу працы таксама ўваходзяць Драгічынскі, Маларыцкі і Пружанскі раёны.

**Бакун, Е.** Профилактика - залог здоровья / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 21 чэрвеня. - С. 3. - В Кобринском зональном центре гигиены и эпидемиологии работают 105 человек, в т. ч. 22 врача.

**Лесик, И.** 70-летие отметил коллектив Кобринского зонального центра гигиены и эпидемиологии / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. - 2014. - 20 снежня.

**Рапинчук, В.** Гигеня – богиня здоровья / Валентина Рапинчук // Кобрин-информ. – 2015. – 18 июня. – С. 26. - ГУ «Кобринский зо¬нальный центр гигиены и эпидемиологии»: история, день сегодняшний.

**Рапинчук, В. В**. Время, события, люди / В. В. Рапинчук // Кобрин-информ. – 2014. – 7 августа, 14 августа, 21 августа, 28 августа. - История становления санитарной службы Кобринского района.

## 15 гадоў з часу стварэння КУП «Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Колас» *(2004)*

Цэнтр размешчаны ў 9 км ад горада Кобрына Брэсцкай вобласці ў маляўнічым сасновым бары плошчай 56 га. Здраўніца пачала функцыянаваць 1 чэрвеня 2004 года, а першыя дзеці прыбылі на аздараўленне 15 чэрвеня 2004 года.

**Детский** реабилитационно-оздоровительный центр «Колос» // Здравницы Брестчины. - Брест, 2012.- С. 40-45.

**Детский** реабилитационно-оздоровительный центр «Колос» // Санаторно-курортные организации Республики Беларусь. - Минск, 2007. - С. 19.

**Савчук, М.** «Колосу» - 10 лет / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. — 5 июня. — С. 5.

## Юбілейныя даты ўстаноў адукацыі

### Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Кобрына» *(1954)* – 65 гадоў

У 1954 годзе ў Кобрыне была адкрыта ***дзіцячая музычная школа*** ў гістарычным цэнтры горада на плошчы Камсамольцаў. Першы педагагічны склад налічваў усяго 8 чалавек, у наш час працуе 91 настаўнік. У першыя гады працы школы заняткі вяліся па трох інструментах: домра, баян і фартэпіяна, у наш час гэта ўжо 17 музычных інструментаў і харэаграфічнае аддзяленне. Да 1998 года навучальная ўстанова называлася Кобрынская дзіцячая музычная школа, з 1998 г. школа набыла статус школы мастацтваў. З 18 лістапада 2011 г. – ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў г. Кобрына». У школе мастацтваў тры творчых дзіцячых калектыва са званнем «узорны».

**Бакун, А.** Тут здзясняюцца мары / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 28 чэрвеня. - С. 5.

**Жук, Е**. Школа искусств в новом проекте / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. - 6 октября. - С. 7. - Кобринская школа искусств примет участие в культурном проекте о трехстороннем партнерском сотрудничестве.

## ДУА «Дзіцячы сад-сярэдняя школа № 4 г. Кобрына» *(1959)* - 60 гадоў

***Сярэдняя школа № 4 г. Кобрына*** здадзена ў эксплуатацыю ў верасні 1959 года. У кастрычніку 1991 г. школа пераходзіць у новы будынак. У 2002 годзе на базе школы створаны класы ваенна-патрыятычнай накіраванасці, у 2004 годзе - класы прававой накіраванасці. На падставе рашэння Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта № 940 ад 16.08.2012 г. установа была рэарганізавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Дзіцячы сад-сярэдняя школа № 4 г. Кобрына».

**Бялоў, Д.** На запаветах переможцаў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. - 6 мая. — С. 1, 2. - Кадэцкія і юрыдычныя класы дзіцячага сада-сярэдняй школы № 4 г. Кобрына ўжо даўно сталі своеасаблівай «візітнай карткай» горада.

**Грышкевіч, С.** Складнік поспеху - пераемнасць / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2015. - 7 красавіка. - С. 7. - Пра высокую эфектыўнасць работы ўстановы адукацыі дзіцячага сада-сярэдняя школа № 4.

## ДУА «Сярэдняя школа № 7 г. Кобрына» *(1979)* - 40 гадоў

Шэсць сярэдніх навучальных устаноў г. Кобрына не маглі змясціць усіх дзяцей, таму ў 1979 годзе была пабудавана яшчэ адна школа. ДУА «Сярэдняя школа № 7 г. Кобрына» - школа з паглыбленным вывучэннем англійскай мовы ў 5-11 класах, з павышаным узроўнем – у пачатковых.

**Пашкович, Л.** «Мой выбор - жить позитивно!»/ Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. - 11 лютага. - С. 3. - В рамках профилактической акции по предупреждению суицидального поведения среди подростков в СШ № 7 прошло мероприятие «Мой выбор — жить позитивно!».

**Кириевская, Е.** «Под сению кулис…» / Елена Кириевская // Кобрин-информ. – 2012. – 25 мая. – С. 9. - Коллектив учащихся СШ № 7 стал лидером Пушкинского фестиваля, организованного в БГУ имени А. С. Пушкина.

## ДУА «Запрудская базавая школа» *(1944)* – 75 гадоў

Школа адкрылася ў 1944 годзе, яна размяшчалася ў прыстасаваным будынку панскага маёнтка. Гэта была пачатковая школа з чатырохгадовым навучаннем. З 1947 года школа была ператворана ў сямігадовую, з 1959 г. школа стала васьмігадовай. У 1985 годзе пабудаваны новы будынак школы.

**Пашковіч, Л.** Абаяльная і спартыўная / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 2 лістапада. — С. 4. - Цікава праходзяць урокі фізічнай культуры ў Запрудскай базавай школе

## ДУА «Мінянская базавая школа» *(1959)* – 60 гадоў

Па ініцыятыве старшыні калгаса Карэнюгіна Аляксандра Іпалітавіча было пачата будаўніцтва новай школы. 1 верасня 1959 года Мінянская школа гасцінна расчыніла свае дзверы. Потым з'явілася асобна пачатковая школа, а на месцы старых будынкаў размясціўся школьны краязнаўчы музей і школьная бібліятэка. Сёння Мінянская школа - гэта сярэдняя агульнаадукацыйная школа.

**Занько, Н**. Вучымся эканоміць / Настасся Занько // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 красавіка. – С. 3. - Мінянская школа заняла першае месца ў рэспубліканскім конкурсе «Энергамарафон-2012» .

## ДУА «Кіселявецкі дзіцячы сад-сярэдняя школа» *(1949)* - 70 гадоў

Годам заснавання Кіселявецкай школы лічыцца 1949 год. У 1968 годзе распачата будаўніцтва новай 8-гадовай школы. З 2003 г. - гэта комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа.

Кондрашук, Н. Лучшая школа агрэгородка / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2012. –20 декабря.– С. 5. - Команда Киселевецкого детского сада-средней школы с победой вернулась с областного конкурса на лучшую школу агрогородка.

## ДУА «Хідрынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад-сярэдняя школа» *(1949)* – 70 гадоў

У 1949 г. у в. Хідры адкрылася 7-гадовая школа (у 1961 г. - 8-гадовая). У 1974 годзе адкрываецца сярэдняя школа. Дашкольная група ДУА «Хідрынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад сярэдняя школа» была адкрыта ў 2014 годзе.

**Кондрашук, Н.** Двойной юбилей Хидринской школы / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. — 13 февраля. — С.2. - Исполнилось 65 лет со дня открытия в Хидрах семилетки и 40 лет – средней школе.

## ДУА «Яслі-сад № 3 г. Кобрына» *(1969)* - 50 гадоў

***ДУА «Яслі-сад № 3 г. Кобрына»*** заснавана ў 1969 г. У 1985 г. праведзена рэканструкцыя.

## ДУА «Яслі-сад № 6 г. Кобрына» *(1959)* - 60 гадоў

***ДУА «Яслі-сад № 6 г. Кобрына»*** пачала сваю працу з 1959 года. Гэта быў першы ведамасны дзіцячы сад у горадзе, і да 2002 года заснавальнікам яго з'яўлялася Кобрынская швейная фірма «Лона». У 2002 годзе дзіцячы сад перайшоў да ўпраўлення адукацыі Кобрынскага райвыканкама.

**Пальто, К.** Проводили лето с песней / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 6 верасня. - С. 8. – В УО «Ясли-сад № 6» отметили последние дни лета большой концертной программой.

**Веремеенко, С.** Полвека - детям! / С. Веремеенко // Кобрин-информ. - 2009. - 29 октября. - С. 5. - 50 лет детскому саду № 6.

## ДУА «Яслі-сад № 16 г. Кобрына» *(1984)* - 35 гадоў

***ДУА «Яслі-сад № 16 г. Кобрына»*** функцыянуе з 1984 года. Знаходзіўся пад ведамствам Кобрынскай прадзільна-ткацкай фабрыкі «Ручайка», а з 3 сакавіка 2001 года перададзены на бюджэтнае фінансаванне Кобрынскага райвыканкама.

**Кондрашук, Н.** Ремонт продолжается / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. - 25 сентября. - С. 2. - Детскому саду № 16 исполнилось 30 лет.

## Дзяржаўная сацыяльна-педагагічная ўстанова адукацыі «Кобрынская дзіцячая веска» *(1994)* - 25 гадоў

Дзяржаўная сацыяльна-педагагічная ўстанова адукацыі ***«Кобрынская дзіцячая веска»*** была арганізавана ў 1994 г. У снежні 1994 г. дзіцячая вёска налічвала 6 дамоў, і ў іх выхоўваліся 60 дзяцей-сірот. Гэта першая ўстанова такога тыпу ў рэспубліцы для выхавання дзяцей-сірот. Зараз у ўстанове адукацыі пражывае і выхоўваецца 92 дзіцяці.

**Бунеева, Л.** Мама на пороге дома / Л. Бунеева // Брэстчына вачамі журналістаў. – Брэст, 2005. – С. 128-134. - О Кобринской детской деревне.

**Пашкович, Л.** День рождения – теплый праздник! / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. – 2016. - 17 снежня. – С. 4. – Кобринской детской деревне исполнилось 22 года.

## ДУ «Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па зімовых відах спорту г. Кобрына» *(2009)* – 10 гадоў

***Дзяржаўная ўстанова «Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па зімовых відах спорту г. Кобрына»*** створана рашэннем Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта ад 16 лістапада 2009 г. № 1624. Установа з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй юрыдычнай асобай, фінансуецца з мясцовага бюджэту. У адпаведнасці з рашэннем Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ад 19 ліпеня 2013 г. № 412 атэставана як

спецыялізаванае вучэбна-спартыўная ўстанова. ДЮСШ па зімовых відах спорту г. Кобрына працуе на базе Лядовай арэны.

## Дзяржаўная ўстанова адукацыі (ДУА) «Раённы цэнтр дзіцячай творчасці»
### *Ансамблю танца «Пралесачкі» (1974) – 45 гадоў*
### *Студыі выяўленчага мастацтва (1974) - 45 гадоў*
### *Эстраднай студыі «Крыніца» (1979) - 40 гадоў*

***Ансамбль танца «Пралесачкі»*** створаны ў ***1974 г.*** (кіраўнік - Святлана Іосіфаўна Чырун). У рэпертуары ансамбля- фальклорныя, сюжэтныя, народныя і сучасныя эстрадныя танцы. С. І. Чырун за падрыхтоўку і ўдзел калектыву ў Міжнародным фестывалі рэгіянальнага танца «Палескі карагод» (2000) узнагароджана Ганаровай граматай. Званне ўзорнага прысвоена ў 1995 г.

***Студыя выяўленчага мастацтва*** створана ў ***1974 г.*** Кіраўнік - Анатоль Рыгоравіч Зуброў. Юныя мастакі - удзельнікі гарадскіх, раённых, абласных выстаў дзіцячай творчасці, рэспубліканскіх мастацкіх конкурсаў і міжнародных праектаў ЮНЕСКА. Работы студыйцаў выстаўляліся ў Анголе, Германіі, Бельгіі, Грэцыі, Японіі, Тунісе, Югаславіі, Італіі, Францыі, Нідэрландах, Польшчы, Чэхаславакіі і інш. Прафесійнымі мастакамі сталі выпускнікі студыі Віталь Трафімаў, Эдуард Качан, Наталля Скарга, Барыс Салівончык і інш. Званне народнай прысвоена ў 1983 г.

***Эстрадная студыя «Крыніца»***. У верасні ***1979 г.*** пры гарадскім Доме піянераў і школьнікаў быў створаны эстрадны ансамбль «Крыніца». Кіраўнік - Мікалай Ігнатавіч Мацвяйчук. З часам ансамбль перарос у эстрадную студыю, дзе займаецца каля 40 хлопчыкаў і дзяўчынак. У рэпертуары - сучасныя эстрадныя песні, дзіцячыя песні з мультфільмаў, беларускія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы, аранжыроўкі да народных песень М. І. Мацвяйчука. Яны неаднаразова былі лаўрэатамі абласных фестываляў «Рытмы маладосці», «Беларусь - мая песня», тэлевізійнага фестывалю «Усе мы родам з дзяцінства». Званне ўзорнага прысвоена ў 1987 г.

**Ансамбль** танца «Пралесачкі» Дома творчасці юных // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 511.

**Студыя** выяўленчага мастацтва // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск,2002. - С. 511.

**Эстрадная** студыя «Крыніца» // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 511.

## Юбілейныя даты ўстаноў культуры

## 80 гадоў з часу адкрыцця цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» *(1939)*

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці гарадской бібліятэкі, якая размяшчалася ў невялікім драўляным доме па вуліцы Суворава. Сюды былі звезены кнігі і абсталяванне з усіх нацыяналізаваных бібліятэк, сталі паступаць пасылкі з усходніх раёнаў рэспублікі. Была нават адкрыта невялікая чытальная зала. За гады Вялікай Айчыннай вайны акупанты разрабавалі кніжны фонд. Пасля вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў ужо 22 ліпеня 1944 г. на нарадзе актыву ў райкаме партыі А. М. Мартынаву было даручана ў найкарацейшы тэрмін аднавіць работу бібліятэкі. Яна размясцілася ў мураваным будынку па вуліцы Савецкай. З 1960 г. Кобрынскую бібліятэку ўзначальвала В. Д. Касько. У 1978 годзе бібліятэчная сетка раёна перайшла на цэнтралізаваную сістэму абслугоўвання, якая аб'яднала 62 бібліятэкі з кніжным фондам 680 тыс. экзэмпляраў. У бібліятэцы было 3 аддзелы: абслугоўвання (6 чалавек), апрацоўкі і камплектавання літаратуры (7 чалавек), методыка-бібліяграфічны (4 чалавекі). У маі 1980 г. у адным з будынкаў па вуліцы Жданава пачала працаваць новая цэнтральная раённая бібліятэка. Сёння цэнтральная раённая бібліятэка абслугоўвае больш за 8 тысяч чытачоў, мае 80 тысяч адзінак бібліятэчнага фонду, як на бумажных, так і на электронных носьбітах. З 2002 г. пры бібліятэцы працуе Публічны цэнтр прававой інфармацыі. З 2010 г. бібліятэка атрымала безлімітны доступ у сетку Інтэрнэт, кругласутачнае злучэнне з кожнага аўтаматызаванага рабочага месца. Ёсць электронная пошта, электронны каталог. Са снежня 2011 г. адкрыты сайт бібліятэкі. З 2013 г. бібліятэка вядзе абслугоўванне карыстальнікаў у электронным рэжыме, працуе ў аўтаматызаванай інфармацыйнай бібліятэчнай праграме ALIS -WEB.

**З успамінаў** А. М. Мартынава // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск, 2002. - С. 416-417.

**Іванова, М. В**. Бібліятэкі Кобрыншчыны / М. В. Іванова // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 414-415.

**Кобринская** центральная районная библиотека // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С.467.

## 35 гадоў з часу адкрыцця кінатэатра «Вясёлка» камунальнага ўнітарнага кінавідовішчнага прадпрыемства «Кобрынская раённая кінавідэасетка» *(1984)*

***Кінатэатр «Вясёлка»*** з'явіўся ў Кобрыне ў 1984 г. па вуліцы Пушкіна. Будынак кінатэатра знаходзіцца ў цэнтры горада. Вялікая зала разлічана на 300 пасадкавых месцаў, малая - на 140 месцаў. Кінатэатр абсталяваны сучасным відэапраектарам, сістэмай Dolby. Да паслуг наведвальнікаў кінатэатра - пракат DVD-дыскаў. У фае кінатэатра з суботы на нядзелю праводзіцца начная дыскатэка. Запрашаюцца DJ з Мінска, іншых рэгіёнаў Беларусі. Выступаюць музычныя калектывы розных кірункаў і стыляў. З верасня па май у кінатэатры «Вясёлка» праходзяць кіналекторыі для школьнікаў горада і раёна, рэгулярна арганізуюцца розныя выставы - дзіцячага малюнка, мастацкіх фатаграфій. У кінатэатры працуе бар.

**Дубіна, Л.** Аб’яднала музыка / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. – 2017. – 26 ліпеня. – С. 8. – У кобрынскім кінатэатры «Вясёлка» праводзяцца рэтра-дыскатэкі.

**Другак, Ж.** В процессе изучения и поиска / Жанна Другак; [беседовала] Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2013. - 4 апреля. - С. 6.

## 50 гадоў з часу стварэння хору Балоцкага клуба ДУК «Кобрынская раённая клубная сістэма» *(1969)*

Хор Балоцкага сельскага клуба створаны ў 1969 годзе. З 1994 г. хор носіць званне народнага. Калектыў – лаўрэат 2 тура І Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, удзельнік міжнародных фестываляў народнай творчасці на Украіне, у Мінску, украінскай песні ў Брэсце (2000). Узнагароджаны дыпломам саюза кампазітараў за прапаганду народнай песні. Неаднаразова беларускае тэлебачанне і радыё запісвалі выступленне хору для радыёперадач “Спадчына”, “Радавод”. Узнагароджаны дыпломам саюза кампазітараў за прапаганду народнай песні.

**Хор** Балоцкага сельскага клуба // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 509.

## 30 гадоў з часу адкрыцця Імянінскай дзіцячай школы мастацтваў (1989)

**Бялоў, Д**. Імянінскай дзіцячай школе мастацтваў – 30 гадоў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2019. - 15 мая. – С. 5.